ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 51 (1688) | Аўторак, 26 чэрвеня 1962 года | Цана 4 кап.

Дружба на вечныя часы

Візіт дружбы ў народную Румынію савецкай партыйна-ўрадавай дэлегацыі на чале з Першым сакратаром ЦК КПСС, Старшынёй Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчовым выліўся ў хвалюючае свята румына-савецкай дружбы, у яркую маніфестацыю адзінства і згуртаванасці краін сусветнай сацыялістычнай садружнасці.

Савецкія госці, апрача Бухарэста, наведалі Бухарэсцкую, Бакэурскую, Хунедаарскую, Олценскую і Дабруджанскую вобласці. У Канстанцы, дзе савецкія госці знаходзіліся з 23 чэрвеня, былі працягнуты гутаркі паміж савецкай і румынскай партыйна-ўрадавымі дэлегацыямі. Яны праходзілі ў атмасферы брацкай дружбы і сардэчнасці, з'явіліся новым доказам поўнага адзінства па ўсіх абмеркаваных пытаннях.

Закончыўшы паездку па краіне, савецкая партыйна-ўрадавая дэлегацыя і румынскія кіраўнікі, якія яе суправаджалі, вярнуліся спецыяльным поездам у Бухарэст.

А другой палове дня 24 чэрвеня ў Вялікай зале Палаца рэспублікі ва ўрачыстай абстаноўцы адбылося падпісанне сумеснай заявы партыйна-ўрадавых дэлегацый Савецкага Саюза і Румынскай Народнай Рэспублікі. Заяву падпісалі Першы сакратар ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчоў і Першы сакратар Румынскай рабочай партыі, Старшыня Дзяржаўнага савета РНР Г. Геаргіу-Дэж. У гэтым дакументе выказаны думкі і пачуцці савецкага і румынскага народаў, аб'яднаных непарыўнымі вузамі дружбы, брацтва і супрацоўніцтва.

Адразу ж пасля падпісання заявы савецкая партыйна-ўрадавая дэлегацыя на чале з таварышам М. С. Хрушчовым і кіруючыя дзеячы народнай Румыніі на чале з таварышам Г. Геаргіу-Дэж накіраваліся на стадыён «Рэспубліка», дзе адбыўся масавы мітынг працоўных румынскай сталіцы, прысвечаны сустрэчы з пасланцамі Краіны Саветаў.

Мітынг адкрыў першы сакратар Бухарэсцкага гарадскога камітэта РРП Фларыян Дэнэлаке. На мітынгу выступілі майстар кузнечнага цэха завода імя 23 жніўня Антанакі Хрыстаке, студэнтка Бухарэсцкага універсітэта Ліліяна Іянеску, прэзідэнт Акадэміі навук РНР Атанасе Жожа. Ад імя працоўных сталіцы, ад імя ўсяго румынскага народа яны выказалі гарачую ўдзячнасць савецкай партыйна-ўрадавай дэлегацыі, М. С. Хрушчову за наведанне краіны з візітам дружбы. З вялікай увагай выслухалі прысутныя прамовы таварышаў Г. Геаргіу-Дэжа і М. С. Хрушчова.

Шматтысячны мітынг працоўных румынскай сталіцы паказаў гатоўнасць румынскіх працоўных ісці і далей пляно да пляча з савецкім народам, з народамі ўсіх сацыялістычных краін да ззяючых вяршынь сацыялізма і камунізма.

25 чэрвеня савецкая партыйна-ўрадавая дэлегацыя вярнулася з Румыніі ў Маскву.

СПЫНІЦЬ!

Лээп СЕМЯЖОН

Неспакойна на сэрцы, калі блакіт сонечнага дня пачынае зацягвацца хмарамі грознай навальніцы. Дзеці, якія толькі што бесклапотна гулялі на скверы і кармілі крошкамі чародкі галубоў, раптам забываюцца на гульні і палахліва горнуцца да маці. Аднак паблізу дом, дзе можна надзейна схавацца ад нечаканай навалы. І ўсё-такі трывожна б'ецца сэрца ў бацькоў — а раптам...

Многа яшчэ загадкавага для чалавечага розуму ў з'явах прыроды. Адарыў красавік раскаваную ад зімовых сцюж зямлю тыднем-двума добрага надвор'я — і раптам, як стыхійнае бедства, наляцеў на Сярэднюю Еўропу халодны май са снегавымі палярнымі цыклонамі. І некалькі дзён зялёныя палі і лясы апраналіся ў белы кажух. Запалярная Якуція ў маі знемагала ад нечуванай спякоты, а жыхары ўсходнееўрапейскіх краін амаль да паловы чэрвеня не расставаліся з зімовымі і дэмісезоннымі паліто.

Што гэта? Чым выкліканы такія анамаліі ў прыродзе? Я не спецыяліст-метэрыёлаг, і мне цяжка даць дакладны адказ, але з таго, што ў гэтай галіне ведаў ужо сказана навукай, мы беспамылкова сцвярджаем: апошнія анамаліі ў прыродзе цесна звязаны з перамяшчэннямі і рухамі ў вышэйшых слаях атмасферы — у космасе.

Касмічныя прасторы, такім чынам, — гэта той яшчэ не зусім пазнаны і асвоены навукай запаведнік. Гаспадаром у якім павінна быць усё чалавецтва. З яго вышыняў павінны зыходзіць на зямлю жыватворныя праменні.

І раптам! Загнаўшы ў тупік перагаворы аб спыненні выпрабаванняў ядзернай зброі ў Камітэце васемнаццаці дзяржаў у Жэневе, хеўра мілітарысцкіх вар'ятаў з Пентагона і іх партнёраў па агрэсіўных кааліцыях наважвае ператварыць гэты «запаведнік» у свой ваенны палігон. Запускаючы свае ракеты з мегатоннымі бомбамі ў касмічныя прасторы, яны тым самым замахваюцца на самае запаветнае — існаванне мільёнаў і мільёнаў людзей. Гэта — безразважлівы выклік атамных маньякаў усяму чалавецтву, яго прагрэсу, яго дабрабыту і будучыні.

Шалёная гонка ўзбраенняў, перанос мілітарысцкай палітыкі ў сферы паветранай прасторы навакольля зямлі можа наклікаць на свет вялізарную бяду. Якая-небудзь адна памылка (дзве такія памылкі ўжо мелі месца: дзве боегалоўкі амерыканскіх вадародных бомб упалі ўжо ў глыбіні Ціхага акіяна і ніхто пакуль што не ведае — дзе дакладна!)— і шугане полымя страшэннага пажару. Гэтаму трэба неадкладна пакласці канец!

Прасторы сусвету не павінны быць атручаны смертаноснымі рэчывамі тэрмаядзерных выбухаў. Кладучыся спаць пасля працоўнага дня, сумленныя людзі Зямлі не павінны пакутваць ад думкі — а раптам! Вар'яцкія жарты з раўнавагай у космасе тояць у сабе такую небяспеку, аб выніках якой наўмысна не жадаюць задумвацца атамшчыкі з Пентагона.

Разгневанае сумленне чалавецтва патрабуе спыніць разбойніцкія акты агрэсіі на вялікіх вышынях, спыніць у імя міру, чалавеколюбнасці і шчасця на Зямлі. Хай распагодзіцца... Хай спакойна вядуць свае гульні дзеці. І няхай набрынялы колас азіміны, выплыўшы з трубкі, рунее пахучымі песцікамі красы.

Абараняючы прасторы космасу ад сляпой лютасці прыхільнікаў разбурэння і хаосу, мы абараняем будучыню не толькі сваю і сваіх дзяцей — будучыню ўсяго чалавецтва. Аб гэтым сведчаць галасы пратэстаў людзей ад Тэмзы да Токіо, аб гэтым трапна сказаў партугальскі паэт-камуніст, вязень салазараўскіх казематаў, Франсіска Мігел:

З якой палёгкай уздыхнуць народы,
Калі спляценнем іх мазольных рук
Удасца знішчыць зло і назаўсёды
Даць права грамадзянства слову «друг»!

Канстанцыя БУЙЛА

БЕЛЫ ГРЫБ

Вырас белы грыб над акіянам,
Страшны ён, забойца той імглісты!
Людзі, кліч хай грымне несціхана:
Рукі прэч! Хай неба будзе чыстым!
Смерці цень хай не плыве над намі,
Над зямлёю нашаю любімай,
Хай яна не ападзе дажджамі
Над якойсьці новай Хірасімай,
Не кране дзіцячай ножкі босай.
Паўшы ў кветкі згубнаю расою.
Хай не йдзе шкілет той безгалосы
Са сваёй няўмольнаю касою.
У нас вясна, квітнее час надзеі,
Час кахання, працы, шчасця, песень,
Дык нашто пускаюць ліхадзеі
Гэты грыб свой белы, сваю плесень!
З жахам сёння маладыя маці
Дня чакаюць, як дзіця народзяць,
Бо нячутна, у празрыстай шаце,
Цені смерці паміж імі ходзяць.
Мо яны плывуць па-над палямі
Без усякай яўнае адзнакі,
Ураджай каб труціць туманамі,
Паўтарыць каб драму Нагасакі.
Людзі! У грыбе гэтым — жах і мукі,
І мільёнаў згуба без магілы.
Дык давайце звяжам моцна рукі
Той варожай смертаноснай сіле!

АД КАМІТЭТА ПА ЛЕНІНСКІХ ПРЭМІЯХ

Камітэт па Ленінскіх прэміях у галіне літаратуры і мастацтва прымае работы на атрыманне Ленінскіх прэмій 1963 года.

На атрыманне Ленінскіх прэмій 1963 года могуць вылучацца творы літаратуры, мастацтва, журналістыкі і публіцыстыкі, надрукаваныя, публічна паказаныя ці выкананыя не пазней 15 чэрвеня 1962 года.

Прадстаўленне работ да Ленінскіх прэмій робіцца праўленнямі саюзаў пісьменнікаў, журналістаў, кампазітараў, мастакоў, работнікаў кінематаграфіі, прэзідыумам ВЦСПС, калегіямі міністэрстваў СССР і саюзных рэспублік, Акадэміяй мастацтваў СССР, рэспубліканскімі тэатральнымі таварыствамі, навукова-даследчымі інстытутамі, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, рэдкалегіямі газет і часопісаў, сходамі працоўных.

Прыём работ будзе праводзіцца да 1 снежня 1962 года.

Прапановы аб прысуджэнні Ленінскіх прэмій, водгукі аб работах, якія вылучаюцца, а таксама ўсе пытанні, звязаныя з афармленнем матэрыялаў, трэба накіроўваць па адрасу: Масква, 1-51, Нягліннная вул., 15, Камітэт па Ленінскіх прэміях у галіне літаратуры і мастацтва пры Савеце Міністраў СССР.

ЮБІЛЕЙ К. С. СТАНІСЛАЎСКАГА

Савет Міністраў СССР у сувязі з надыходзячым у студзені 1963 г. 100-годдзем з дня нараджэння вялікага рускага рэжысёра і акцёра К. С. Станіслаўскага стварыў Усесаюзны камітэт па правядзенню юбілею К. С. Станіслаўскага ў наступным складзе: тт. Кедраў М. М. (старшыня), Аджубей А. І., Аджамян В. Н., Аляксеева К. К., Алекпераў А., Бабійчук Р. Ул., Бальшоў Д. Р., Герасімаў С. А., Жукаў Р. А., Завадскі Ю. А., Іагансон Б. Ул., Касымаў М., Кожамкулаў С., Карняйчук А. Е., Кульмамедаў А., Кыдыкеева Б., Ахлопкаў М. П., Платонаў Б. В., Пагодзін М. Ф., Пакроўскі Б. А., Папоў А. І., Папова Н. В., Пракоф'еў Ул. Н., Рудзінскас Ю. П., Сіманаў Р. М., Смілгіс Э. Я., Саладоўнікаў А. В., Тарасава А. К., Ціханаў М. С., Тамур І. А., Таўстаногаў Г. А., Ужвій Н. М., Федзін К. А., Фурцава К. А., Хаджаеў А., Харава А. А., Хрэннікаў Ц. М., Чаркасаў М. К., Штырбу К. А., Шастаковіч Д. Д., Яблачкіна А. А.

Для душы...

Тэкст А. АРКАДЗЬЕВА.
Фота С. АНАНКІ.

Гэта вельмі розныя людзі — розныя па ўзросту і характарах, розныя ў іх прафесіі і лёс. Але адно захапленне збліжае іх. Гэта захапленне мастацтвам. Вечарамі, пасля працы, збіраюцца яны разам у Доме народнай творчасці — лепяць, малююць, развучваюць песні і танцы, вышываюць. Адпачынак стаў для іх творчасцю, мастацтва — духоўнай патрэбай.

Магчыма, у гэтым ёсць частачка той мары, якую пранёс праз турмы і ссылкі буржуазна-памешчыцкай Польшчы камуніст Аляксандр Канстанцінавіч Шыдлоўскі. Калісьці, у гады падпольнай работы ў Вільні, Клецку, Відзе, запісваў ён народныя песні і абрады, марыў прысвяціць сябе музычнай творчасці. Але толькі пасля вызвалення Заходняй Беларусі Аляксандр Канстанцінавіч цалкам аддаўся любімаму занятку. Валодаючы прыгожым голасам, ён спяваў у хоры Р. Шырмы, тут жа пачаў і сам складаць песні. Пазней яны ўвайшлі ў рэпертуар не толькі створанага ім хору, але і многіх калектываў рэспублікі. А. Шыдлоўскі цяпер заслужаны дзеяч культуры БССР, працуе дырэктарам Гродзенскага Дома народнай творчасці. Ён, як і яго жонка Варвара Яфімаўна, — душа вялікага і дружнага калектыву Дома народнай творчасці.

Прыгожай справе прысвяцілі сваё жыццё муж і жонка Шыдлоўскія — несці мастацтва людзям.

Вось яны схіліліся над нотамі новай песні Аляксандра Канстанцінавіча. Так і зняў іх наш фотакарэспандэнт.

Мастацкая вышыўка. Гэта таксама мастацтва, якое патрабуе не толькі майстэрства, але і добрага густу. Густу, майстэрству і навучаецца дзесяцікласніца Зоя Некрашэвіч на курсах машыннай вышыўкі, якімі кіруе А. Пірожнік. Скончыўшы курсы, яна сама будзе вучыць іншых. Бо гэтыя курсы рыхтуюць кіраўнікоў гурткоў для клубаў і дамоў культуры.

НАШ СУЧАСНІК

ШТО ТАКОЕ ШЧАСЦЕ?

Старое, як свет, пытанне: што чалавеку патрэбна для шчасця? І наогул — што такое шчасце? Якое яно — шчасце?

Гэта расказ аб шчасці. Не, гэта расказ аб чалавеку, які ведае, што такое шчасце, умее быць шчаслівым і даваць шчасце іншым.

Коратка падстрыжаныя сіваватыя валасы. Энергічныя, часам нават рэзкія рухі. Уменне хутка схапіць сутнасць размовы ці спрэчкі і адразу вызначыць свае адносіны да справы. Імкненне быць заўсёды і ва ўсім карыснай людзям. І пагляд — на дзіва глыбокі, чысты, які ўмее і падбадзёрыць і паўшчуваць, пагляд то раптам падзявочы гарэзлівы, то задуменны і строгі. Такая Марыя Уладзіміраўна Рут.

Калі ў чалавека неспакойнае сэрца, ён заўсёды знойдзе справу сваім рукам, прымяненне сваім ведам, нават калі па гадах яму пара на адпачынак.

...Вельмі ўтульная і чыстая кватэра на вуліцы Ватуціна ў Гомелі. На кніжных паліцах і ў шафе — кнігі па будаўніцтву і музыцы, аб выхаванні дзяцей і мастацкай літаратуры. Каля піяніна — стос нот.

— А вось гэта, — паказвае Марыя Уладзіміраўна на арыгінальнага ўзору дываны, — мы з мужам самі рабілі. Проста цікава было — што атрымаецца. І, здаецца, атрымалася...

Дываны сапраўды выдатныя.

Дык хто ж яна, Марыя Уладзіміраўна Рут? Інжынер? Педагог? Музыкант? І тое, і другое, і трэцяе. Але галоўнае — чалавек. Вельмі прывабны, сціплы, сумленны, які любіць жыццё і людзей.

Біяграфія ў яе вялікая і цікавая. Уласна кажучы, у ёй — часцінка біяграфіі нашай краіны.

Адзінаццацігадовай дзяўчынкай, яшчэ да рэвалюцыі, яна стала студэнткай Маскоўскай рэпертуар складаюць наступныя спектаклі: «Трэцяя патэтычная» М. Пагодзіна, «Маракі не здаюцца» М. Імшанецкага, «Ракетчыкі» К. Рапапорта, «Дзень добры, Барыс!» В. Васільева, «Абавязковае спатканне» Г. Трыфанава, а таксама «Глыбіня» В. Купрына. З класікі пойдуць пастаноўкі «Пігмаліён» Б. Шоу і «Анжэла» В. Гюго.

Пасля Мінска тэатр на працягу месяца будзе знаёміць са сваімі работамі працоўных Гродна, Баб-

Сцэна са спектакля «Глыбіня» ў пастаноўцы драматычнага тэатра Чырвонасцяжнага Балтыйскага флоту. У ролях: (злева направа) Буслава — заслужаны артыст Татарскай АССР Д. Швец, Захара Кранца — артыст М. Шапіра, Сімбірцава — артыст А. Краўчук, Траяна — заслужаны артыст Латвійскай ССР М. Церахаў.

ЗНАМЯНАЛЬНАЙ ДАЦЕ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Споўнілася сорак год з таго дня, калі слаўны камсамол Савецкай Беларусі ўзяў шэфства над Чырвонасцяжным Балтыйскім флотам. Шмат разоў дэлегацыі беларускіх камсамольцаў гасцілі на ваенных караблях у гераічных абаронцаў нашай Радзімы. Балтыйскія маракі таксама неаднаразова прыязджалі ў Мінск з візітамі дружбы да сваіх шэфаў.

Саракагоддзю гэтага выдатнага шэфства і прысвяціў наш творчы калектыў летнія гастролі па гарадах Беларусі. Створаны звыш трыццаці гадоў назад з удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, Тэатр Чырвонасцяжнага Балтыйскага флоту вырас у вялікую прафесіянальную трупу. Калектыў з першых жа дзён творчай дзейнасці ўзяў курс на стварэнне свайго арыгінальнага рэпертуару героіка-рамантычнага плана. Толькі за апошні час на нашай сцэне былі пастаўлены арыгінальныя творы, у большасці мясцовых аўтараў, — «Глыбіня» В. Купрына, «Трывога матроскіх сэрцаў» Ул. Жычкіна і М. Чабатаева, «Сувязь часу» А. Краўчука.

У трупе тэатра, якую ўзначальвае галоўны рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтва РСФСР А. Струнін, працуюць вопытныя майстры — заслужаныя артысты Латвійскай ССР Ю. Пятроўскі і М. Церахаў, заслужаны артыст ТАССР Д. Швец, заслужаны артыст Каз. ССР І. Калачанаў, артысты Л. Шангелідзе, К. Бялова, М. Свірына, С. Антаноўскі, Н. Андрэеў і іншыя. Ёсць у нас і добрая моладзь — выпускнікі тэатральных навучальных устаноў.

Свае гастролі на беларускай зямлі мы пачалі з Полацка, дзе паказалі ў пачатку чэрвеня 15 спектакляў (з іх два шэфскія), выязджалі з творчымі справаздачамі ў калгасы і новабудоўлі раёна.

Тэатр прыбыў у Мінск менавіта ў той дзень, калі ЦК ЛКСМ Беларусі арганізаваў у памяшканні Тэатра юнага гледача ўрачысты сход, прысвечаны саракагоддзю шэфства Беларускага камсамола над маракамі-балтыйцамі. Сакратар ЦК ЛКСМБ А. Ваніцкі ў сваёй прамове расказаў прысутным пра тое, як нараджалася дружба паміж моладдзю, камсамольцамі рэспублікі і воінамі Балтыйскага флоту. Прадстаўнік Ваеннага савета Балтыйскага флоту Я. Пачупайла, выступаючы на гэтым урачыстым вечары ад імя матросаў, старшын і афіцэраў Балтыкі, шчыра вітаў камсамол Беларусі, заняты мірнай стваральнай працай, і перадаў ЦК ЛКСМБ памятны падарунак маракоў-балтыйцаў — матроскую бесказырку і корцік.

Калектыву тэатра і некаторым акцёрам на ўрачыстым сходзе былі ўручаны ганаровыя граматы ЦК ЛКСМБ. Пасля гэтага быў паказаны спектакль «Глыбіня» пра мірныя будні доблесных маракоў. Так мы пачалі выступленні ў беларускай сталіцы, якія працягнуцца да 1 ліпеня. Наш гастрольны

Руйска і Быхава. Гастрольная паездка па Беларусі, прысвечаная знамянальнай даце ў жыцці камсамола Беларусі і маракоў савецкай Балтыкі, да многага абавязвае наш творчы калектыў. І мы прыкладзём усе намаганні для таго, каб сустрэчы тэатра з патрабавальнымі беларускімі гледачамі ўсюды прайшлі плённа і радасна.

А. КУЛАГІН,
артыст Тэатра Чырвонасцяжнага Балтыйскага флоту.

ЛЕКЦЫІ-КАНЦЭРТЫ Ў ВЁСЦЫ

З Віцебскай вобласці ў Мінск вярнулася група артыстаў Беларускай філармоніі. У раённых цэнтрах, у калгасах і саўгасах адбылося больш чым 40 лекцый-канцэртаў.

Лектар-музыказнаўца і выканаўцы наведалі Лёзна, Гарадок, Міёры, Расоны і рад іншых пунктаў. Імі дадзены лекцыі-канцэрты на тэмы: «Аб добрым музычным гусце», «Як навучыцца разумець музыку», «Глінка», «Моцарт», «Музыка ў жыцці Леніна».

Брыгады артыстаў філармоніі выступаюць у Магілёўскай і Гродзенскай абласцях. Беларуская філармонія на працягу гэтага сезона правядзе ў сельскіх мясцовасцях больш чым 300 лекцый-канцэртаў.

УСЛЕД ЗА ФАКТАМ...

А. БУТАКОЎ

Беларускае тэатразнаўства — бадай што адна з самых маладых навук у рэспубліцы. Першыя кнігі па гісторыі нацыянальнага тэатра ў нас з'явіліся толькі ў пасляваенныя гады. Мастацтвазнаўствам (у тым ліку вывучэннем тэатра) займаецца спецыяльная навукова-даследчая ўстанова Акадэміі навук БССР — Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Пішуць аб тэатры і педагогі Тэатральна-мастацкага інстытута, і дзеячы самога тэатра. Гэтыя кнігі і даследаванні могуць ужо скласці цэлую бібліятэчку.

Прыемна і тое, што нашы тэатразнаўцы, даследуючы гісторыю тэатра, пачынаюць звяртацца і да сучасных яго праблем. Аб гэтым сведчыць выхад у свет кнігі Уладзіміра Няфёда «Сучасны беларускі тэатр», у якой разглядаецца творчае жыццё беларускіх драматычных тэатраў у 1946—1959 гг.

Новая праца Ул. Няфёда — вынік назіранняў аўтара над рэпертуарам беларускіх творчых калектываў. Ён выкарыстаў таксама шматлікія артыкулы і рэцэнзіі крытыкаў і дзеячоў тэатра, апублікаваныя ў перыядычным друку.

Кніга цікавая з пазнавальнага боку, а таксама як гісторыка-даведачная праца. Яна з'явіцца сур'ёзнай дапамогай будучым гісторыкам і даследчыкам беларускага прафесіянальнага тэатра. У полі зроку даследчыка — у асноўным два буйнейшыя тэатральныя калектывы: Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы і Тэатр імя Якуба Коласа. Але ў ёй разглядаецца рэпертуар і ўсіх іншых беларускіх труп, адзначаны пастаноўшчыкі, рэжысёры, мастакі, выканаўцы роляў большасці спектакляў, даецца аналіз многіх найбольш значных, на думку аўтара, пастановак. Праўда, тэты аналіз абмяжоўваецца часам рамкамі газетнай ці часопіснай рэцэнзіі. Асабліва тэта адносіцца да першых раздзелаў кнігі.

Аўтар імкнецца гаварыць абавязкова пра ўсе п'есы, якія толькі з'явіліся ў беларускай драматургіі ў перыяд, які ён разглядае, незалежна ад таго, былі яны пастаўлены на сцэне ці не. Але навошта, напрыклад, гаварыць пра такія слабыя ў мастацкіх адносінах творы, як «Хлеб» І. Гурскага, «Дарагі госць» Ю. Рудзько і «Прамень будучыні» В. Віткі, якімі ў той час ні адзін з тэатраў рэспублікі не зацікавіўся?

А вось аналізу вялікага сцэнічнага палатна — «Раскіданае гняздо» па драме Янкі Купалы ў Тэатры імя Якуба Коласа Ул. Няфёд адводзіць усяго некалькі старонак, гаворыць пра яго неяк паспешліва, мімаходзь. У той жа час шырока і падрабязна разглядаецца слабы спектакль «Цені знікаюць» С. Свірыдава ў Бабруйскім тэатры.

Прыкладам добра прааналізаваных спектакляў з'яўляецца «Гамлет» (рэжысёр В. Бебутаў) і «Алазанская даліна» К. Губарэвіча і І. Дорскага (рэжысёр М. Міцкевіч), якія пастаўлены ў Тэатры імя Якуба Коласа. Пра гэтыя сцэнічныя творы на старонках кнігі гаворыцца многа і выразна.

Хацелася б, каб таксама ярка і вобразна былі прааналізаваны ў кнізе і многія іншыя, асабліва арыгінальныя, спектаклі беларускіх калектываў.

Размова пра такія буйныя творы, як «Канстанцін Заслонаў», «Пяюць жаваранкі», «Выбачайце, калі ласка!» і іншыя, атрымалася некалькі сухаватая і невыразная. Між тым, на нашу думку, менавіта гэтыя спектаклі вызначалі творчае аблічча тэатраў у час, пра які ідзе гутарка.

Ул. Няфёд справядліва зазначае, што ў гэты перыяд сучасная п'еса заняла вядучае месца ў рэпертуары творчых калектываў рэспублікі, што тэатры імя Я. Купалы і імя Я. Коласа па праву сталі называцца тэатрамі савецкай п'есы. І гэта, перш за ўсё, таму, што яны ў сваіх пастаноўках імкнуліся грунтоўна адлюстроўваць сучасную рэчаіснасць і глыбока раскрываць вобразы савецкіх людзей. Таму мы маем права патрабаваць ад даследчыка вобразнага, сапраўды мастацкага аналізу, памянёных спектакляў.

Падрабязна гаворыць аўтар пра ўплыў на дзейнасць беларускіх тэатраў пастаноў ЦК ВКП(б) «Аб часопісах «Звезда» і «Ленинград» і «Аб рэпертуары драматычных тэатраў і мерах па яго паляпшэнню», аб выступленнях «Праўды» супраць групы тэатральных крытыкаў-касмапалітаў і «тэорыі» бесканфліктнасці.

Усе з'явы ў беларускім тэатры ў перыяд з 1946 па 1959 гг. аналізуюцца даследчыкам на аснове гэтых пастаноў і выступленняў. Аднак нельга не ўлічваць, што ў гэты ж перыяд адбыўся XX з'езд КПСС (1956 г.), а ў 1961 г., раней чым кніга Ул. Няфёда была здадзена ў набор, перад XXII з'ездам была апублікавана новая Праграма КПСС — праграма пабудовы камунізма ў нашай краіне. Гэтыя гістарычныя, велічныя падзеі ў жыцці нашай Радзімы не знайшлі неабходнага адлюстравання ў кнізе. Пра XX з'езд аўтар толькі ўспамінае ў кароткім уступе да другога раздзела.

Між тым, XX з'езд, які асудзіў культ асобы і адстаяў ленінскі прынцып калектыўнага кіраўніцтва, адкрыў новую, шырокую дарогу развіццю нашага мастацтва.

Мы маем права патрабаваць ад даследчыка сучаснага тэатра навуковага аналізу з пазіцый рашэнняў XX і XXII з'ездаў партыі.

Культ асобы скоўваў творчую ініцыятыву дзеячоў тэатра, ён стаў вялікай перашкодай на шляху далейшага развіцця ўсяго савецкага мастацтва. Пра ўсё гэта неабходна было сказаць, пацвердзіўшы думку канкрэтнымі прыкладамі з практыкі беларускіх тэатраў. Дастаткова прыгадаць, як ствараліся спектаклі «Залп «Аўроры» ў Тэатры імя Янкі Купалы і «Незабыўны 1919-ты» ў Тэатры імя Якуба Коласа, каб убачыць усю шкоднасць культу асобы і яго вынікаў у тэатральным жыцці. Але пра спектакль «Незабыўны 1919-ты» толькі ўпамінаецца ў кнізе, а пастаноўцы «Залп «Аўроры» даецца даволі паблажлівая ацэнка.

У кнізе ёсць шэраг тэарэтычных выказванняў па пытаннях драматургічнага майстэрства, аб жанравых законах драмы, трагедыі і камедыі. На жаль, яны раскіданы па ўсёй кнізе і рэдка выкарыстоўваюцца для аналізу канкрэтных мастацкіх з'яў. Адсюль адвольнасць ацэнак і перабольшванне ролі таго ці іншага твора ў гісторыі развіцця нацыянальнага тэатра і драматургіі.

Напрыклад, Ул. Няфёд дае празмерна высокую ацэнку п'есе і спектаклю «З народам» К. Крапівы (Тэатр імя Янкі Купалы) і змяншае вартасці такога твора, як «Гэта было ў Мінску» А. Кучара ў тым жа тэатры. Між тым, п'еса А. Кучара і па пабудове сюжэта і па раскрыццю характараў дзеючых асоб напісана не менш цікава, а ў гледача карысталася куды большым поспехам.

Станоўчую ацэнку дае Ул. Няфёд і слабай пастаноўцы п'есы «Зацікаўленая асоба» К. Крапівы. А між тым, яна ішла на сцэне купалаўскага тэатра менш дзесяці разоў. Дарэчы, аўтар няцвёрда трымаецца на пазіцыях станоўчай ацэнкі спектакля. На стар 93—94 ён піша, што «спектакль у цэлым быў добра прыняты гледачом і крытыкай», што «ў спектаклі прынцыпова верна вырашаўся асноўны канфлікт п'есы». А на 95-й старонцы чытаем: «У цэлым спектаклю не хапала ўздзеяння на сэрцы, на пачуцці гледачоў, што тлумачыцца недастатковай вастрынёй асноўнага канфлікту п'есы».

Перабольшваюцца таксама вартасці спектакляў «На белым свеце» П. Ніліна (Тэатр імя Якуба Коласа), «На крутым павароце» К. Губарэвіча і «Каб людзі не журыліся» А. Макаёнка (Тэатр імя Янкі Купалы).

Трэба было б удакладніць і ацэнку няўдалага, на мой погляд, спектакля па п'есе А. Чэхава «Чайка», які не вызначаўся арыгінальнасцю рэжысёрскай работы ў купалаўцаў. З усіх персанажаў «Чайкі» ў спектаклі быў вырашаны найбольш правільна, па-чэхаўску, толькі вобраз Сорына артыстам П. Малчанавым. Усіх жа іншых выканаўцаў напаткалі творчыя няўдачы.

Думаецца, што ў кнізе дадзена занадта высокая ацэнка творчай дзейнасці і рэпертуару Тэатра юнага гледача, які не мае яшчэ выразнага мастацкага аблічча і пакуль што найчасцей адрасуе свае спектаклі больш дарослым, чым дзецям і юнацтву.

Спектаклі Бабруйскага перасоўнага тэатра ставяцца Ул. Няфёдам амаль на ўзровень спектакляў вядучых тэатральных калектываў рэспублікі. Між тым, трупа Бабруйскага тэатра таксама яшчэ знаходзіцца ў стадыі станаўлення, многім яе спектаклям не хапае прафесіяналізму, пра што неабходна было аўтару шчыра сказаць.

Ул. Няфёд празмерна хваліць асобныя тэатры і спектаклі. А гэта можа быць няправільна ўспрынята цэлымі калектывамі і асобнымі тэатральнымі дзеячамі, можа нарадзіць у іх пачуццё самазаспакоенасці. Празмерная лакіроўка ў кнізе падмяняе гістарычную праўду аб развіцці беларускага тэатра, дэзарыентуе чытачоў і будучых даследчыкаў.

Гэта тым больш недарэчна, што сам жа Ул. Няфёд перасцерагае крытыкаў і гісторыкаў тэатра ад няправільных ацэнак. Вось што ён піша: «Нічым неабгрунтаванае захапленне... тлумачыцца заганнай практыкай усякім чынам пераўвялічваць мастацкія заслугі драматургаў і тэатраў, калі яны бяруцца за палітычна актуальную тэму. Гэта, бясспрэчна, прыносіла вялікую шкоду нашаму тэатральнаму мастацтву».

Не раскрыты ў кнізе істотныя недахопы і памылкі ў сцэнічным увасабленні такіх п'ес, як «Жаніцьба Бальзамінава» і «Праўда добра, а шчасце лепш» А. Астроўскага, «Дамы і гусары» А. Фрэдра — у Тэатры імя Янкі Купалы, «Дама-невідзімка» Кальдэрона, «Юсціна» Х. Вуолійёкі — у Тэатры Я. Коласа, «Салемскія вядзьмаркі» А. Мілера — у Бабруйскім тэатры і рад іншых.

Больш грунтоўнага, шырокага аналізу заслугоўваюць спектаклі Тэатра імя Я. Купалы, у якіх даецца вобраз Ул. І. Леніна («Крамлёўскія куранты», «Грозны год», «Вечная крыніца», «Трэцяя патэтычная»). Спектаклі пра Леніна — найбольш значныя ў рэпертуары купалаўцаў апошніх гадоў. Яны пастаўлены рознымі рэжысёрамі, у іх два выканаўцы ролі Ільіча, афармлены спектаклі рознымі мастакамі, — усё гэтае дае цікавы матэрыял для змястоўнай і вялікай размовы. Аўтар жа кнігі абмяжоўваецца толькі кароткім аналізам работы П. Малчанава і Б. Платонава над роллю Ул. Леніна.

Кожны новы раздзел у кнізе будуецца па пэўнай схеме: спачатку гаворыцца пра агульныя задачы краіны, а потым ідзе разбор «...наступных п'ес на тэму...» ці рабочага класа, ці барацьбы за мір, ці працоўнага жыцця калгаснай вёскі і г. д. Натуральна, што ў жыцці савецкага народа ўсе гэтыя тэмы цесна ўзаемазвязаны. Цесна пераплятаюцца яны і ў п'есах савецкіх драматургаў. Таму штучна выглядае падзел раздзелаў кнігі па тэматыцы. Апроч таго, у розных перыядах (1946—1953 і 1953—1959 гг.) тэматыка непазбежна паўтараецца (скажам, п'есы на тэму Вялікай Айчыннай вайны). Таму ў наступных раздзелах аналіз твораў на знаёмую ўжо раней тэму ўспрымаецца з меншай увагай, яго значнасць зніжаецца.

І апошняе. Амаль 15 год на сцэне Тэатра імя Янкі Купалы ідзе (а не ішла, як піша Ул. Няфёд) п'еса англійскага драматурга Шэрыдана «Дзень цудоўных падманаў» («Дуэння»). У кнізе даецца рэзка адмоўная ацэнка гэтага спектакля. Аўтар лічыць яго выключна забаўным прадстаўленнем. І калі сацыяльна вострая п'еса выкарыстана ў тэатры пастаноўшчыкам, як сцвярджае Ул. Няфёд, «толькі як повад для стварэння займальнага відовішча», а сатырычная характарыстыка пустога арыстакратычнага грамадства падменена камедыйнай інтрыгай, дык усё ж трэба было б больш грунтоўна раскрыць недахопы спектакля і тыя безумоўныя вартасці (я маю на ўвазе выдатныя работы акцёраў і перш за ўсё бліскучую ігру Г. Глебава), якія робяць гэты спектакль папулярным у гледача і сёння.

Пры ацэнцы падобнага роду спрэчных і супярэчлівых з'яў патрабуецца бездакорная прынцыповасць. Гісторык павінен быць верны праўдзе падзей.

Калі даследчык тэатра толькі фіксуе факты, — гэта яшчэ не навуковая праца. Галоўная мэта тэатразнаўчай навукі заключаецца, на мой погляд, у тым, каб праўдзіва і аб'ектыўна раскрыць асноўныя ідэйна-мастацкія працэсы, якія адбываліся ў той ці іншы час, высветліць, наколькі глыбока адлюстраваны ў творчасці драматургаў, артыстаў і рэжысёраў грамадзянскія тэндэнцыі той ці іншай эпохі, прааналізаваць галоўныя мастацкія плыні, іх асаблівасці.

Уладзімір Няфёд. «Сучасны беларускі тэатр» (1946—1959). Мінск, 1961.

Творчыя справаздачы

Ад спектакля да спектакля расце выканаўчае майстэрства драматычнага гуртка Хойніцкага раённага Дома культуры. За апошнія тры гады аматары сцэны паказалі многа спектакляў. Сярод іх — «Равеснікі навальніцы» Ц. Саладара, «Лявоніха на арбіце» А. Манаёнка, «На ўскраіне сяла» М. Алтухова і інш.

Днямі гледачы Хойнікаў былі запрошаны на прагляд камедыі «Сады цвітуць». Гэты ж спектакль гурткоўцы паказалі членам сельгасарцелей «Савецкая Беларусь», «Рассвет» і інш.

ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

КУПАЛАЎСКІЯ ЧЫТАННІ

У актавай зале Магілёўскага педагагічнага інстытута многа год назад вёў цёплую гутарку са студэнтамі і выкладчыкамі, чытаў ім свае вершы Янка Купала.

Сёлета ў інстытуце шырока адзначаецца 80-годдзе з дня нараджэння любімага песняра. Вялікім поспехам карыстаюцца тут Купалаўскія чытанні. Былі прачытаны даклады «Горкі і Янка Купала», «Эстэтычныя погляды паэта», «Янка Купала і музыка», «Сувязі паэта з дзецьмі і юнацтвам». З дакладамі выступалі студэнты Т. Сутоўская, Ж. Юсі, С. Храмянкова і іншыя. Праведзены вялікі літаратурна-мастацкі вечар. На ім удзельнікі мастацкай самадзейнасці чыталі вершы Янкі Купалы, спявалі песні беларускіх кампазітараў, напісаныя на творы паэта.

Студэнты — аматары драматычнага мастацтва — пад кіраўніцтвам выкладчыка Магілёўскага культасветвучылішча В. Ермаловіча падрыхтавалі спектакль «Прымакі» па п'есе Я. Купалы.

Чэрвень 1949 года. Адкрыццё помніка Янку Купалу ў горадзе Мінску. Выступае народны паэт БССР Якуб Колас.
Фота С. ЧЫРЭШКІНА.

ГАРТАЮЧЫ СТАРОНКІ ГАЗЕТ

Нашы даследчыкі зрабілі нямала па выяўленню новых матэрыялаў, звязаных з жыццём і літаратурнай дзейнасцю Янкі Купалы. Але многае застаецца яшчэ невядомым літаратуразнаўству. У гэтым пераконваешся, калі знаёмішся з камплектамі старых газет, што выдаваліся ў дарэвалюцыйны час. З некаторымі з гэтых матэрыялаў мы і хочам пазнаёміць чытача.

ПЕРШЫ ВОДГУК НА «ЖАЛЕЙКУ»

Зборнік вершаў «Жалейка» выйшаў, як вядома, у 1908 г. З'яўленне кнігі Купалы стала падзеяй вялікай важнасці не толькі ў творчым жыцці самога паэта, але і ўсёй беларускай дамакрастычнай літаратуры. Яна выклікала жывую цікавасць чытача і была цёпла сустрэта прагрэсіўнай крытыкай. «Жалейцы» была прысвечана рэцэнзія, апублікаваная ў «Нашай ніве», № 17, 1908 г. Газета «Минский курьер» надрукавала (№ 112, 1908 г.) артыкул Ул. Самойлы, у якім зборнік беларускага паэта разглядаецца як «вялікае свята на вуліцы «Маладой Беларусі».

У газеце «Минское эхо» (№ 34, 1908 г.) мы знайшлі яшчэ адну рэцэнзію на «Жалейку». Яе напісаў беларускі пісьменнік Ядвігін Ш., які ў тыя гады актыўна супрацоўнічаў у «Нашай ніве».

Рэцэнзія Ядвігіна Ш. прыцягвае да сябе ўвагу ўжо тым, што з'яўляецца першым па часе водгукам на вершаваны зборнік Купалы. У «Нашай ніве» рэцэнзія на «Жалейку» была надрукавана 15 (28) верасня. Артыкул Ул. Самойлы — 23 жніўня. А рэцэнзія ў газеце «Минское эхо» апублікавана ў нумары ад 9 ліпеня, г. зн. на паўтара-два месяцы раней за першыя дзве. Выходзіць, што найбольш раннім водгукам на «Жалейку» з'яўляецца не артыкул Ул. Самойлы, як піша В. Іваўшын («Советская Отчизна», 1955 г., № 3, стар. 131), а рэцэнзія Ядвігіна Ш.

Ва ўсіх работах пра Янку Купалу сказана, што першы яго паэтычны зборнік выйшаў у верасні. Так, у кнізе «Любімы паэт беларускага народа», выдадзенай АН БССР у 1960 г., мы чытаем: «У верасні ў Пецярбургу ў выдавецтве «Загляне сонца і ў наша аконца» выходзіць першая кніга вершаў паэта «Жалейка» (стар. 248). Тое ж і ў альбоме «Янка Купала. Жыццё і творчасць», Мінск, 1959 г., стар. 184. Рэцэнзія Ядвігіна Ш. дазваляе ўстанавіць больш раннюю дату. Як мы ўжо сказалі, яна была надрукавана ў газеце 9 ліпеня, а напісана, відаць, у канцы чэрвеня ці ў пачатку ліпеня. Не даводзіцца сумнявацца ў тым, што аўтар рэцэнзіі чытаў «Жалейку» пасля выхаду яе з друку. Ён, напрыклад, піша, што кніга мае «памылкі ў выданні» і што для вокладкі «можна было ўзяць лепшую, больш трывалую паперу». Ядвігін Ш. прыводзіць поўную назву кнігі і выдавецтва, якое выпусціла яе.

Думаецца, што «Жалейка» выйшла з друку не пазней чэрвеня, магчыма, вясною 1908 г. Гэта пацвярджаецца і аб'явамі ў «Нашай ніве». Упершыню чытачам паведамлялася, што рыхтуецца выданне «Жалейкі» ў 1906 г. Потым, у № 8 ад 11 (24) сакавіка 1908 г., з'явілася наступная аб'ява: «Суполка «Загляне сонца і ў наша аконца» выдала пакуль што і прадае... «Дудка беларуская». «Гапон». «Жалейка» Янука Купалы, цана 50 кап.».

Такое ж паведамленне з'явілася і ў №№ 9, 11, 18 «Нашай нівы», прычым, у № 18 адзначалася, што цана зборніка «на простай паперы 50 кап., а на лепшай — 80 кап.»

У продаж «Жалейка» паступіла значна пазней — з-за арышту, што быў накладзены на зборнік камітэтам па справах друку пры міністэрстве ўнутраных спраў.

Не выпадкова і тое, што першым адгукнуўся на кнігу Купалы Ядвігін Ш. У тыя гады ён, як і аўтар рэцэнзіі ў «Минском курьере» — Ул. Самойла, быў блізкі да паэта. «З Ядвігіным Ш., — успамінаў Купала, — я вельмі зблізіўся. Ён мне многа расказваў пра незнаёмыя мне да гэтага часу пісьменніцкія справы і г. д. Чалавек ён быў з вышэйшай адукацыяй... прытым вельмі цікавы і дасціпны субяседнік».

У другім месцы, гаворачы пра знаёмых яму людзей на пачатку літаратурнай дзейнасці, Я. Купала піша: «Застаюцца з таго часу Ядвігін Ш. і У. І. Самойла. Абодва яны, людзі сур'ёзныя, культурныя і самі літаратары, супрацоўнічалі ў газетах і, вядома, усяляк заахвочвалі мяне ў маім пісанні».

Аўтар рэцэнзіі піша, што пакуль што ўстрымаецца ад дэталёвага разгляду большасці вершаў зборніка. Ядвігін Ш. збіраецца зрабіць гэта ў другі раз. Ён дае толькі агульную ацэнку кнізе вершаў Купалы, якога называе «народным паэтам», «чулым і ўспрымальным» мастаком. З прычыны цэнзурных умоў Ядвігін Ш. не мог, зразумела, адкрыта пісаць пра падзеі тых год, калі была напісана большасць вершаў, якія ўвайшлі ў зборнік «Жалейка». Але яўна маючы на ўвазе рэвалюцыю 1905 г. і наступную рэакцыю, ён піша: вершы «былі напісаны ў тыя гады, калі ў нашай спакутаванай радзіме вельмі хутка чаргаваліся то асляпляльныя бляскі, то чорныя цені, што не магло не адбіцца» на вершах паэта.

У рэцэнзіі адзначаецца «чысціня захавання» беларускай мовы ў вершах Купалы. «Класічным узорам» яе Ядвігін Ш. лічыць верш «Саха».

Ядвігін Ш. паведамляе, што, як яму «ўдалося даведацца, нямала матэрыялу падрыхтавана ўжо паэтам для другога тома». Другая кніга вершаў, пра якую піша тут рэцэнзент, выйшла ў 1910 г. Гэта быў зборнік «Гусляр».

Гісторыка-літаратурнае значэнне рэцэнзіі Ядвігіна Ш. бясспрэчнае. Апроч усяго іншага, яна абуджала цікавасць у чытача да тады яшчэ маладога паэта Я. Купалы, да беларускай літаратуры, якая развівалася і з кожным годам усё больш мужнела.

СЯБРЫ І ВОРАГІ ПАЭТА

Пасля выхаду зборніка «Жалейка» імя Янкі Купалы стала асабліва папулярным. Яго вершы пачынаюць перакладаць на рускую, польскую і іншыя мовы. Адзін з такіх вершаў пад назваю «Беларусу» ў перакладзе У. С. (магчыма, У. Самойла.) быў надрукаваны ў газеце «Минский курьер» 13 красавіка 1908 г. Дарэчы, газета адзначае, што гэты верш — са зборніка «Жалейка». Гэта яшчэ раз сведчыць, што кніга Купалы выйшла вясною, а не восенню 1908 г.

У тых артыкулах аб беларускай літаратуры і культуры, што апублікаваны ў некаторых пецярбургскіх, мінскіх, гомельскіх і іншых рускіх газетах, пра Купалу гаворыцца як пра пісьменніка вялікага таленту. У артыкуле «Культурныя нарысы», надрукаваным у «Полесской мысли» (1909 г., № 17), сказана, напрыклад, што ў асобе Я. Купалы беларуская літаратура «мае значную цікавасць і ўплыў» у народзе.

Пра Купалу напісана і ў артыкуле «Беларускі тэатр», апублікаваным у газеце «Столичные вести» (№ 1, 1 красавіка 1913 г.), што выдавалася ў Пецярбургу. Артыкул гэты напісаны І. Варанько ў куткім часе пасля пастаноўкі камедыі «Паўлінка» студэнтамі-беларусамі Пецярбургскага універсітэта у лютым таго ж года. П'еса, як вядома, мела вялікі поспех, а Янку Купалу быў наладжаны гарачы прыём.

Поспех «Паўлінкі» навёў Варанько на думку напісаць пра беларускі тэатр серыю артыкулаў. «Беларусь, — піша ён, — у якія-небудзь пяць-шэсць год паказала, што яна мае такое ж права на самавызначэнне, як і кожны іншы свабодны народ, мае сваё культурнае «я», сваё мастацтва».

І. Варанько прыгадвае беларускі вечар, што адбыўся ў Пецярбургу ў лютым 1910 г. «Зала курсаў Заслаўскага, — чытаем мы ў артыкуле, — дзе адбыўся першы беларускі спектакль (на гэтым вечары прысутнічаў і Янка Купала. — І. Б.), ламалася ад наплыву публікі: паліцыі прыйшлося пагражаць пратаколам за перапаўненне залы, але публіка не сунімалася. Спектакль прыцягнуў гледачоў сваёй навізною, арыгінальнасцю».

І. Варанько ўказвае, што беларускі тэатр заваёўвае ўсё большую папулярнасць у паўночна-заходніх губерніях. «Кіпіць работа над стварэннем роднага мастацтва, — піша ён. — Уся наша недасведчанасць у гэтым пытанні тоіцца галоўным чынам у адсутнасці перакладчыкаў з беларускай мовы, бо каб былі апошнія, мы ведалі б не толькі драматычныя творы беларусаў, але і багатую паэзію (Янка Купала, Максім Багдановіч, Якуб Колас), у якой яны дасягнулі такіх поспехаў».

Маючы на ўвазе і «Паўлінку», аўтар артыкула піша, што п'есы беларусаў не перапоўнены эфектнымі фабуламі, а «багатыя псіхалогіяй, праўдзівыя, маляўнічыя сваёй рэальнасцю... І ў весялосці, і ў спяванні, і ў танцах — затоена, задрапірована ўсё тое ж беларускае гора».

Артыкул «Беларускі тэатр» выклікаў вялікую цікавасць у чытача. Ён быў перадрукаваны многімі газетамі, што выдаваліся ў Беларусі, і ў прыватнасці «Гомельской мыслью» (1913 г., № 27), «Наше утро» (Гродна, 1913 г., № 36).

Аднак імя Купалы, яго паэзія сустракалі далёка не заўсёды спачувальны і тым больш прыхільны водгук, як гэта мела месца ў артыкулах Ул. Самойлы і І. Варанько. Чуліся і іншыя галасы — варожыя паэту і прагрэсіўнай беларускай літаратуры.

Мае цікавасць у гэтай сувязі артыкул, апублікаваны ў № 6 ад 17 ліпеня 1912 г. у газеце «Витебский вестник». Артыкул гэты прысвечаны выхаду ў свет зборніка на польскай мове пад назваю «З аколіц Дзвіны». Адным са складальнікаў і рэдактараў яго быў вядомы збіральнік фальклору В. П. Федароўскі. У зборнік, побач з іншымі прадстаўнікамі «польскай інтэлігенцыі Віцебскай зямлі», быў уключаны і Я. Купала, што выклікала законны пратэст Рамуальда Зямкевіча («Наша ніва», 1912 г., № 10). Складальнікі змясцілі ў кнізе ў перакладзе на польскую мову два вершы Я. Купалы «А хто там ідзе?» і «З песень аб сваёй старонцы», надрукаваўшы і партрэт іх аўтара.

Рэцэнзент «Витебского вестника» з адкрытай варожасцю гаворыць пра Янку Купалу і яго вершы, якія, на яго думку, з'яўляюцца няўдалым перайманнем Някрасава. Асабліва незадаволены аўтар артыкула вершам «З песень аб сваёй старонцы», «Паслухаць Янку Купалу, — піша ён, — дык у Беларусі... вёскі бедныя, замест садоў ля дамоў тырчаць бярозкі. Людзі ходзяць абадраныя, непісменныя».

Імкнучыся аслабіць уздзеянне верша Купалы, ачарніць паэта ў вачах чытача, рэцэнзент сіліцца пераканаць апошняга, што ўсё, пра што піша паэт, — проста няпраўда. Каб давесці гэта, малюецца ідылічная карціна жыцця сялян на Гродзеншчыне, дзе нібы «каля амаль кожнай сялянскай хаты есць садок, нярэдка перад домам кветнічак; на палях бачны дзікія грушы, часта адменнага смаку... У вёсках нярэдка відаць цагляныя дамы, галоўная вуліца выбрукавана. Шмат выдатных лугоў. Земляробства зрабіла выдатныя поспехі». «Тыя бярозкі, — працягвае далей рэцэнзент, — пра якія піша Янка Купала, большасцю захаваліся яшчэ ад часоў прыгоннага права».

Вакол творчасці Я. Купалы ішла, як вядома, інтэнсіўная барацьба. Рэакцыя ўсяляк цкавала паэта, бачыла ў ім свайго злейшага ворага. Нездарма А. Ельскі напісаў на тытульнай старонцы зборніка «Жалейка»: «У вышэйшай ступені небяспечная кніга».

ВЕНСКАЯ ГАЗЕТА ПРА КУПАЛУ

У 1910 г. ў Вене пачала выходзіць газета пад назвай «Славішэ таглат» («Славянская штодзённая газета»). Рэдакцыя яе цікавілася беларускай літаратурай, выпісвала «Нашу ніву» і час ад часу інфармавала сваіх чытачоў аб «беларускіх навінах», як было напісана ў адным з нумароў. Так, 21 снежня 1910 г. (№ 37) газета адзначыла 25-годдзе з дня смерці выдатнага беларускага пісьменніка В. Дуніна-Марцінкевіча, які, па словах «Славішэ таглат», першым «адважыўся пачаць пісаць на беларускай мове», якой пагарджала дваранства.

У № 3 ад 9 лістапада таго ж года ў аддзеле «Літаратура, тэатр, мастацтва» была змешчана нататка пра Янку Купалу. Венская газета паведамляла, што ў выдавецтве А. Грыневіча ў Пецярбургу выйшаў у 1910 г. «зборнік вершаў беларускага паэта Янкі Купалы». Назва зборніка не ўпамінаецца, але, відаць, маецца на ўвазе кніга «Гусляр».

У 1910 г. слава Янкі Купалы як паэта далёка перайшла межы Беларусі, хоць з часу выхаду яго першага зборніка мінула менш двух гадоў. Сведчанне гэтага і нататка пра яго ў газеце «Славішэ таглат».

Ісідар БАС.

ДЛЯ ДУШЫ...

Турбамашыніста Гродзенскай цеплаэлектрацэнтралі Аляксандра Іванавіча Ліпеня захапіў вобраз заснавальніка беларускай філалогіі Я. Карскага, і ён вырашыў выляпіць яго партрэт.

За работай ля скульптурнага станка і сфатаграфавалі мы яго.

Больш шасці год захапляецца А. Ліпень жывапісам і скульптурай. Яго работы выстаўляліся на рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаўках, ён узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Не слава, а любоў да мастацтва кліча яго амаль кожны дзень у студыю выяўленчага мастацтва Дома народнай творчасці. Аляксандр Іванавіч працуе над галерэяй партрэтаў праслаўленых людзей Гродзеншчыны. Ім створаны скульптурныя вобразы генерала Парыжскай камуны Урублеўскага, беларускага нацыянальнага героя Кастуся Каліноўскага, пісьменніцы Цёткі.

Зоя Пяткевіч з маленства любіць сцэну. Амаль ніводзін канцэрт агітбрыгады не абыходзіцца без яе. Зоя ездзіць з сябрамі па калгасах, выступае ў цэхах і на палявых станах. Яшчэ нядаўна дзяўчына працавала афіцыянткай і толькі ў вольны час займалася мастацтвам. Цяпер яна аддае любімай справе ўвесь свой час — яе запрасілі працаваць метадысткай у Дом народнай творчасці.

ПАЭТ, БЛІЗКІ ПОЛЬСКАМУ СЭРЦУ

Гадавіны нараджэння вялікіх паэтаў, калі яны адзначаюцца паза іх родным краем, выліваюцца ў маніфестацыю радасных і дружалюбных пачуццяў, скіраваных не толькі да саміх творцаў, але таксама — у вялікай ступені — да народаў, якія іх далі.

Так і павінна быць. Кожны сапраўды вялікі паэт звязаны са сваім народам усімі часцінкамі сваёй творчай асобы. І, можна сказаць, аб велічы яго сведчыць не толькі талент, але і тое, наколькі моцна ён звязаны са сваім народам. Толькі сапраўды народныя і праўдзівыя творы забяспечваюць іх аўтарам пачэснае месца ў вялікім пантэоне чалавецтва.

80-годдзе з дня нараджэння вялікага беларускага паэта Янкі Купалы дае нам, палякам, добрую магчымасць выказаць пачуцці захаплення і ўдзячнасці да братняга беларускага народа.

Захапленне — таму што народ, які натхніў аднаго са сваіх сыноў на такую палымяную і ўзнёслую, патрыятычную і глыбока чалавечную паэзію, заслугоўвае найвялікшага захаплення.

Удзячнасці — таму што Янка Купала як слаўны прадстаўнік беларускага народа неаднаразова, справай і словам, выказваў сваю сардэчную любоў да Польшчы і пашану да яе культурных традыцый, што нас надзвычай узрушае і абавязвае.

Янка Купала сваёй шчырай і самабытнай, а разам з тым і рамантычна-ўзнёслай паэзіяй блізкі нашаму Славацкаму, пяснярскай і грамадзянскай нотай — Канапніцкай і Сыракомлі, рэвалюцыйным запалам — Бранеўскаму. Усіх гэтых паэтаў Янка Купала выдатна перакладаў на мілагучную беларускую мову і тым самым выклікаў у нас да яго яшчэ большую ўдзячнасць.

На жаль, гэты доўг наш да апошняга часу не аплочаны. Вельмі мала паэтычных твораў Янкі Купалы перакладзена на польскую мову. На нашых сцэнах не ставіліся яго цудоўныя п'есы. Не напісаны вычарпальныя працы аб яго творчасці.

Будзем спадзявацца, што гадавіна, якая зараз адзначаецца, стане для нас штуршком для таго, каб разлічыцца з гэтай нашай запазычанасцю. Вымагае гэтага і наша народная годнасць, і наша любоў да высакароднага беларускага народа — любоў, якой ніхто ўжо ніколі не зможа азмрочыць ці пагасіць; любоў, для ўмацавання якой так многа зрабіў вялікі беларускі паэт Янка Купала.

Ежы ЕНДЖЭЕВІЧ,
польскі літаратар і перакладчык.

Старонкі абласнога літаратурнага аб'яднання

СЁННЯ ВЫСТУПАЮЦЬ ЛІТАРАТАРЫ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ

ПУБЛІКУЮЦЦА: апавяданні В. Нікалаенкі і П. Шасцерыкова, вершы А. Пысіна, В. Матэвушава, В. Галайды, С. Пацёмкіна, А. Гарэліка і В. Карпечанкі.

Магілёўшчына з даўніх часоў славіцца літаратурнымі талентамі. Тут была створана (па думцы вучоных — студэнтамі Горацкага сельскагаспадарчага інстытута) паэма «Тарас на Парнасе». На Магілёўшчыне нарадзіўся і вырас адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры В. І. Дунін-Марцінкевіч. З Магілёўшчынай так ці інакш звязан жыццёвы і творчы шлях многіх беларускіх пісьменнікаў.

У даваенны час і пасля вайны тут выдаваліся альманахі, паасобныя літаратурна-мастацкія зборнікі («Дняпроўскія ўсплёскі», «Літаратурны Магілёў», «Дняпро»), дзе друкаваліся лепшыя творы мясцовых пісьменнікаў.

Багатае літаратурнае жыццё на Магілёўшчыне і цяпер. У абласным і раённых цэнтрах працуюць літаратурныя аб'яднанні і гурткі. Некалькі гадоў назад тут створана абласное літаратурнае аддзяленне. Напярэдадні XXII з'езда КПСС пісьменнікі Магілёўшчыны падрыхтавалі і выдалі кнігу нарысаў «Людзі Прыдняпроўя» — аб ударніках кемуністычнай працы, перадавіках народнай гаспадаркі і культуры вобласці.

Актуальнасцю тэматыкі, паэтычным майстэрствам характарызуецца творчасць магіляўчаніна Аляксея Пысіна. Нядаўна Аляксей Пысін з групай іншых беларускіх пісьменнікаў ездзіў у Казахстан, на цалінныя землі, сустрэўся там са сваімі землякамі-беларусамі. У выніку гэтай паездкі з'явіўся новы цыкл вершаў пра цалінніка. Частка іх ужо апублікавана ў перыядычным друку. Хутка выйдуць у свет новыя два зборнікі вершаў паэта.

Старэйшы паэт Магілёўскага аддзялення Васіль Матэвушаў напісаў новыя вершы аб роднай партыі, героях-касманаўтах, людзях працы, здаў у выдавецтва новы зборнік сваіх твораў.

У канцы мінулага года выйшла з друку першая кніга для дзяцей настаўніка В. Карпечанкі «Сонейка ўзышло». Запланаваны да выдання першыя кнігі вершаў С. Пацёмкіна (Касцюковіцкі раён), В. Ракава (Магілёўскі раён), А. Канапелькі (Магілёў), А. Гарэліка (Бабруйск).

Актыўна працуюць і магілёўскія празаікі. Пятро Шасцерыкоў здаў у друк раман пра машынабудаўнікоў і зборнік апавяданняў для дзяцей. Мікалай Герасімаў заканчвае раман пра рэвалюцыйныя падзеі 1917—1920 г г. у Беларусі і ў Ленінградзе. Анатоль Іваноў (Бабруйск) напісаў аповесць «Суровае юнацтва» і падрыхтаваў да перавыдання раман «На Далёкім Усходзе». Падрыхтавалі да выдання свае кнігі М. Шумаў (Магілёў), В. Нікалаенка (Касцюковіцкі раён), І. Аношкін (Магілёў).

П'есу аб магілёўскіх падпольшчыках напісаў студэнт педінстытута В. Атрашкевіч. Яна была пастаўлена сіламі інстытуцкага драматычнага гуртка і атрымала станоўчы водгук у гледачоў.

Па надзённых пытаннях крытыкі і літаратуразнаўства часта выступае ў друку Якуб Усікаў. Цяпер ён распрацоўвае тэму «Гісторыя беларускай камедыяграфіі».

У вобласці праводзіцца значная работа па выхаванню літаратурнай моладзі. На літаратурных серадах, якія праводзяцца два разы ў месяц, абмяркоўваюцца пераважна творы маладых і пачынаючых пісьменнікаў. У апошні час былі абмеркаваны творы студэнта Магілёўскага медвучылішча С. Панізніка, слухача Магілёўскай савецка-партыйнай школы В. Галайды, настаўнікаў М. Шумава і А. Канапелькі, урача А. Мельнікава, калгасніка А. Палітыкі (Крычаўскі раён) і інш.

Члены абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР, апрача творчай работы, прымаюць актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці вобласці.

А. МАКАРЭВІЧ.

Аляксей ГАРЭЛІК

Рукі

Рукі гэтыя... Ім бы аловак якраз,
Несці кніжкі ды сшыткі ў школу.
Але ім давялося ў той вогненны час
Справу мець з аўтаматам і толам.
А сплыла навальніцы жахлівае цень,
На будоўлі памчалі машыны.
Рукі шчодра ў падмуркі выносістых сцен
Укладалі цэмент і цагліны.

Як паклікаў бязмежны алтайскі прастор,
Неабжытыя ясныя далі,
Колькі часу без стомы, ад рання да зор,
Цаліну яны рупна ўзнімалі...
А табе працягнуў — знікла цвёрдасць рукі,
Неяк дзіўна яны памякчэлі.
І хоць ім выпадаў час нялёгкі такі, —
Не грубелі,
Не агрубелі.



Магілёў. Плошча імя Леніна.

Мал. А. КАНДРУСЕВІЧА.

Васіль НІКАЛАЕНКА

Здароў, Пархвен!

АПАВЯДАННЕ

На ганку новай пяцісценнай хаты сядзеў прафесар Парфірый Сямёнавіч Гнацюк. Ён адпачываў пасля дзённай спёкі, на поўныя грудзі дыхаў чыстым паветрам, любаваўся цудоўным, змалку блізкім краявідам. За выганам пачыналіся паплавы з чародамі гусей і качак, з гуртамі жывёлы, а за паплавамі, на пагорку, — малады сасоннік. Адтуль аж сюды далятае пах жывіцы, водар хвоі.

— Без мяне выраслі,— падумаў прафесар пра сасонкі.— Вось ён, закон прыроды. Вечнае абнаўленне! Старое ідзе на злом, маладое расце. Гэтак і мы.— Парфірый Сямёнавіч правёў кароткімі таўставатымі пальцамі па блішчастай лысіне. — Старэем... Хутка і на злом!

На ганак выйшла жонка Парфірыя Сямёнавіча — поўная маладжавая бландзінка.

— Сядай, Ларыса, — пасунуўся Парфірый Сямёнавіч, даючы побач з сабой месца жонцы. — Якая прыгажосць, га! — кіўнуў ён на паплавы, дзе выснаваліся ўжо лёгкія шалікі туману.

— Казачны край, Аркадзія! — насмешліва загаварыла Ларыса Пятроўна. — Шкада, што ты нарадзіўся матэматыкам, а не паэтам.

— Шкада, што і ў маёй жонкі няма гэтай божай іскаркі, хоць яна і філолаг. Ларачка, як гэта не бачыць хараства там, дзе яно сапраўды ёсць?

— Хараство! Ха-ха-ха! — Ларыса Пятроўна звонка засмяялася. — Дзе ж яно, тваё хвалёнае хараство? Лясы, казаў, дрымотныя, мядзведзі...

— Мядзведзяў, пэўна, няма, а лясы — вунь яны, хіба не бачыш? Праўда, пры маёй памяці там пушча сінела, а цяпер, як той паэт казаў, племя маладое, незнаёмае — малады гай. Эх, як хутка ляціць час! Ці даўно тут сцежкі таптаў?..

— Пастушком бегаў, — дадала Ларыса Пятроўна.

— І пастушком. А як жа?— ажывіўся Парфірый Сямёнавіч.

Пэўна, напамінак пра пастушка крануў тую самую струну душы, звон якой асабліва прыемны прафесару. Ён ніколі не праміне выпадку (хай гэта будзе ў сямейнай гутарцы ці сярод вучоных-калег), каб не сказаць: «З падпаска жыццё пачынаў». І цяпер ён загаварыў:

— Падшывальцам гадоў дзесяці я ўжо гойсаў з пугай, зарабляў на хлеб... Аднак ці толькі з пугай? Ці пуга помніцца? Было тут такое — ого! Дзе тыя хлопцы, тутэйшыя кімаўцы, з якімі кулака карчаваў? Верхаводам у нас быў Косця Перамёт, лепшы мой дружбак. От жа была гарачая галава!

Вуліцай прайшлі мужчыны з косамі. Парфірый Сямёнавіч узіраўся ў іх твары, стараўся пазнаць. От можа каторы і ёсць адзін з тых кімаўцаў, што «карчавалі кулака»!? Але не пазнаў нікога. І не дзіва. Парфірый Сямёнавіч не быў у роднай вёсцы з таго часу, як у трыццаць першым годзе паехаў на рабфак. Знайшоў там, у горадзе, работу, каб можна было вучыцца без старонняй падмогі, займеў новых сяброў, добрых знаёмых. Непрыкметна неяк з Пархвена стаў Парфірыем Сямёнавічам, паявіліся іншыя інтарэсы, іншыя клопаты. І пакрысе забыліся родны кут, пуга падпаска і сябры-кімаўцы. У рэдкіх пісьмах да сястры Марыны, адзінай сваёй радні, Парфірый Сямёнавіч усё абяцаўся гасцямі і ўсё не ехаў.

З гароду паказалася Марына. На плячы яна несла кошык спелых, аж свіціліся, яблык.

— Марына, — запытаўся Парфірый Сямёнавіч, — а Косця Перамёт — дзе ён? Не тут часам?

— Тут, — апусціла кошык з яблыкамі Марына. — Ты ж як тады паехаў, дык яго старшынёй калгаса абралі. Да самай вайны старшынстваваў. А як пачалася вайна, у партызаны пайшоў. Паранілі яго там моцна — ледзьве акрыяў. І зноў, як прагналі немцаў, арцельную гаспадарку пачаў ладзіць. А было той гаспадаркі адзін конь на калгас ды пажарышчы. Каб не Косцік, дык і ці перажылі б рэзрух... А так адбудаваліся во як, і абжыліся, не горш за іншых.

— О, Косцік — галава! Даўняга гарту хлопец! Кімавец! Вось з ім і пачыналі мы тут новае жыццё будаваць, — ні то жонцы, ні то сабе гаварыў Парфірый Сямёнавіч. І да Марыны: — Ён і цяпер старшынёй?

— Не, во ўжо шэсць гадоў, калі не болей, як пастухом.

— Так, так, так, — Парфірый Сямёнавіч хацеў нешта сказаць, як раптам Марына перапыніла.

— А ты паглядзі... Пазнаеш, хто ідзе? Паглядзі, Пархвен...

З таго боку вуліцы, наўскасяк, перасякаючы дарогу, ішоў чалавек у гумавых ботах, з дажджавіком на руцэ.

— Косця! Далібог ён!

А той, цупкі і лёгкі, высока несучы галаву з пасівелымі скронямі, не тоячы шчырай усмешкі сваіх добрых вачэй, ішоў проста ў двор.

— Каго бачу! — выгукнуў Парфірый Сямёнавіч і памкнуўся з ганка.

— Лёгкі на слове, — сказала Марына.

— Добры вечар, — павітаўся Перамёт.— Здароў, Пархвен!

— Здароў, Косця, здароў!— той аберуч паціснуў руку Перамёта і, абхапіўшы за плечы, паляпаў яго па плячы. — Колькі зімаў, лет, га? А ты яшчэ бадзёры! Малайчына!

— Ды ёсць яшчэ трохі пораху, — усміхнуўся Перамёт.

Жанчыны пайшлі ў хату.

— Ну, дык як жывеш? Расказвай, — пачаў Парфірый Сямёнавіч.

— Ды нішто... На жыццё не наракаю — добра жыву. Шкада толькі, што ў хаце сам-насам з жонкай застаўся. Дзеці паразляталіся, хто куды. Дачка замуж выйшла, адзін сын у аспірантуры ў Мінску, другі на Сахаліне. Сумнавата іншы раз. А ў цябе што? Ты, кажуць, прафесар?

— Кажуць? Ха-ха! Бач ты, пачулі ўжо!— ажывіўся Парфірый Сямёнавіч. — Ці думаў ты калі-небудзь, Косця, што твой сябра Пархвен прафесарам стане?

— Чаму ж не? Я сам збіраўся ў прафесары, — усміхнуўся Перамёт.

— Збіраўся, кажаш? Так-так, — Парфірый Сямёнавіч на хвіліну змоўк, задумаўся, а потым, быццам нешта ўспомніўшы, ускінуў на Перамёта вочы: — Косця, ты што, за пастуха ў калгасе?

— Ага, за пастуха, — адказаў той.

— Гм... Дзіўна...

— А што ж тут дзіўнага?

— Ты ж старшынёй быў. І някепскім. Марына мне гаварыла пра цябе. І раптам пастух. За якія гэта грахі пугу табе ўсучылі?

— Ну і сказаў жа ты, Пархвен: усучылі! — засмяяўся Перамёт. — Не ўсучылі, а сам узяў. І не за грахі, вядома. Цяпер, брат, у калгасе іншы размах. Не з маімі ведамі. Ды і сілы ўжо не тыя. Прыехаў тут адзін хлопец, аграном, з акадэміі. Перадаў яму гаспадарку. Кіруй, кажу, а я памаленьку ля скаціны.

— Саступіў, кажаш, месца? Хе-хе-хе! Без бою саступіў месца былы кімавец! — Парфірый Сямёнавіч узрушана і энергічна ляпнуў Перамёта па плячы. — Фантазёр ты, Косця! У пастухі пацягнула! Арыгінальна!

— А цяпер абы каго не бяруць у пастухі, — неяк спахмурнеўшы, адрэзаў Перамёт.— І давай мы пра гэта іншым разам, Пархвен. А то пасварымся, чаго добрага. Ведаеш, якая справа. У мяне провады сягоння. Сын ад'язджае, той, каторы на Сахаліне. Так што прашу на хлеб-соль, за дарагога госця будзеш. З жонкаю, вядома. І Марыну заві.

— У госці, кажаш? О, гэта, як гаворыцца, са шчырай душой. Дзякую, Косцік, што не забыў... Але, ведаеш, у цябе там... пэўна, гарэлка ды іншае што будзе, а я ні ў рот гэтага зелля. Сэрца...

— Знойдзем што-небудзь і без гарэлкі. Такі квасок ёсць з мёду.

— А можа... іншым разам?

— Іншым разам — само сабой. А сёння, сам разумееш, сына выпраўляю.

— Каб раней, Косцік, а то да мяне тут прыходзілі ўжо. Дырэктар школы. Ты ж, пэўна, чуў, брат да яго прыехаў. Цімох... У адным інстытуце з жонкай працуе. Не пайсці — няёмка. Пакрыўдзіцца.

Бачачы, што Перамёт спахмурнеў, Парфірый Сямёнавіч паспяшыў сказаць:

— Толькі не крыўдуй, Косцік. Мы ж свае людзі — збяромся неяк, пагамонім, чарку—ліха на яе — перакулім. А сёння не магу.

— Навошта апраўдвацца, Пархвен! — Перамёт падняўся з ганка. — Не можаш, ну і не можаш. Цімох — чалавек далікатны, можа, і праўда пакрыўдзіцца, калі не прыйдзеш. А я не крыўдую. — Ён пастаяў, штосьці думаў, потым прказаў: — Трыццаць гадоў мы з табой, Пархвен, не бачыліся. А памятаеш, як бывала... Эх, ды што ўспамінаць? Ну, я пайду. А то мяне ўжо зачакаліся недзе.

— З вялікай бы ахвотай, каб не... Ну ды ладна, збяромся неяк. — Парфірый Сямёнавіч зноў ашчаперыў Перамёта, прытуліў да сябе, устрасяноў. — Як я рады, Косцік! Ты такі ж, як і быў, няўломак! Заходзь, чуеш?

— За табой чарга, — сказаў Перамёт і пайшоў, накульгваючы на левую нагу. Хада была ўжо не такой лёгкай і жвавай, як тады, калі спяшаўся да ганка...

— У госці зваў, — сказаў Парфірый Сямёнавіч, зайшоўшы ў хату.

— Гэта і ёсць той Косцік, гарачая галава? — запытала жонка.

— Была — гарачая, — Парфірый Сямёнавіч прайшоўся па пакоі, ківаючы галавой, нібы дакараючы каго. — Пастух...

— І не зусім пастух, — павярнулася да яго Марына. — Ён у нас дэпутат.

— Дэпутат? — падняў галаву Парфірый Сямёнавіч. — У Вярхоўным Савеце?

— У Вярхоўным, — адказала Марына. — Во ўжо другі раз галасавалі за яго.

— Дэпутат, — па складах паўтарыў Парфірый Сямёнавіч.— Глядзі ты, куды шыбануў! Я ж казаў — галава. А не пахваліўся. Чакай жа! Ларыса,— забегаў Парфірый Сямёнавіч.— Сходзім да Косціка. І ты, Марына!

— А Цімафей Лукіч?

— Цэлы будзе твой Лукіч.

— А такт, Парфірый? — У Ларысы Пятроўны пырхнулі бровы. — Мы ж абяцалі.

— Да дзябла такт! Я трыццаць гадоў сябра не бачыў, а ты мне — т-а-к-т!

— А і праўда, Ларыса Пятроўна, сходзімце, — стала ўгаворваць і Марына. — З Цімохам у Маскве такты-тахты будуць, а тут дружбакі сустрэліся. Цэлы век не бачыліся!

Ларысу Пятроўну ўгаварылі. Яна дастала мужу шыкоўны касцюм, сама апранула лепшую сукенку і падсела да люстэрка. Марына таксама корпалася ў шафе, выбірала, што лепшае надзець.

Праз паўгадзіны яны падыходзілі ўжо да Перамётавай хаты. Праз расчыненыя вокны чулася вясёлая гамонка. Выразна даляцеў звонкі жаночы голас:

— Не журыся, Канстанцін Патапавіч. Пагрэбаваў — ну і ліха з ім. Падумаеш: прафесар-р!

— Ну і што, калі прафесар?— зашчабятаў другі.

— Ціха, жанчынкі, — загаварыў Перамёт. — Прафесар, дэпутат... Навошта чыны і званні ўспамінаць? Лішняе гэта, не з той, як кажуць, песні. Я не прафесара зваў у госці, а Пархвена, колішняга свайго дружбака. Але Пархвена няма.

— Ну, што, схадзіў да Косціка? — кпліва і злосна спытала Ларыса Пятроўна.

Парфірый Сямёнавіч пільна, з дакорам паглядзеў на жонку:

— Ты як хочаш, а я схаджу! — сказаў ён і цвёрдымі крокамі ўзыйшоў на ганак.

Аляксей ПЫСІН

Перакаці-поле

Ледзь стэп дыхне і ледзьве дрогне
У стаўку хмурынка-паплавок, —
Ужо бярэцца на дарогу
Бясшумны прывідны клубок

Травы, што з кораня знялася,
Травы, што высахла ад спёк.
У клубок саломінка ўплялася,
Учапіўся з зернем каласок.

На абыйсці, не змераць поле
Вятрам у самы доўгі дзень.
У полі перакаці-поле
Уласны даганяе цень.

Зямлі не чуючы пад бокам,
Не маючы для ўзлёту крыл,
Ляціць і коціцца з падскокам
Туды, туды, дзе небасхіл.

Куды спяшаецца так з рання,
Уцякае ад якой бяды?
Ці чутна конская іржанне,
Ці стэп малоцяць капыты?

Не выбіраючы дарогі,
Бягуць ў тургайскія пяскі
Неразгаданыя трывогі,
Неразматаныя клубкі.

* * *

А. К.

На ўзлессі дуб, нібыта манумент:
Ні жалудоў на ім, ні лісця...
Хавае тайны навакольны свет
Таго, што тут было калісьці.

Самотна часам над звычайным пнём,
Што пакідаюць дрывасекі...
Якім жа, дуб, цябе пяклі агнём,
Якім цябе жалезам секлі!

Відаць, не тайна гэта для жывых.
Стаіць на зломе белы бусел.
Счарнелы дуб і ён — з вясны ўдваіх, —
Агульны ў іх нябачны вузел.

Ужо даўно дзяцей не мае птах,
Не мае буслянят цыбатых.
Буслы, буслы на ссечаных дубах,
Як напамін, як боль па стратах...

Па тых, хто ссечан, хто ў баях згарэў,
Над кім карэнні траў спляліся.
Глядзяць у сэрца з-пад зялёных дрэў
Дубы — без жалудоў і лісця...

Пятро ШАСЦЕРЫКОЎ

Мая пасада

РАСКАЗ ВАРТАЎНІКА

□ □

Якая пасада ў калгасе самая цікавая? Ага задумаліся? Можа, свінаром быць, як праслаўлены Яраслаў Чыж? А можа, машыны вадзіць, ведаць іх душу, як наш механік Лявон Гаеўскі?

Не, не, не ўгадаеце! Яшчэ не так даўно ў вёсцы адна была прафесія: селянін. А цяпер? Механік, электраманцёр, радыётэхнік, камбайнер, токар, інжынер. Я ўжо не кажу—трактарыст ды шафёр. Якіх толькі машын не дае ў гаспадарку дзяржава! Трактары, камбайны, кукурузасаджалкі, бульбакапалкі... Усіх не пералічыць. Сёлета вунь набылі машыну: гной сама грузіць і сама ж раскідае!

Але ўсё ж ні адну з гэтых пасад не параўнаеш з маёй. Вы смяецеся? Дарэмна, далібог, дарэмна! Я ўжо гэта ведаю: пятнаццаць гадоў сцерагу грамадскае дабро. Пасля ранення, як інваліда, вылучыла мяне праўленне на гэтую пасаду. Хто-колечы пасмейваўся... А я проста сказаў сам сабе: «Вартаўнік, Селівон, гэта — вартавы, няхай сабе і на грамадзянскім пасту!» Наш брат, хто служыў у арміі, ведае высокія абавязкі вартавога. Гэта асоба недатыкальная.

Дарэчы, скажу я вам, што пасада гэтая і самая старадаўняя.

Дык вось. Я таксама вартаўнік. І скажу вам шчыра, што мне гэтая пасада падабалася. Хоць і небяспечная пасадча, а — падабалася. А чаму небяспечная, нябось ведаеце. У злодзея хто самы небяспечны вораг? Вартаўнік. Каго злодзей больш чым бога, баіцца? Нашага брата, вартаўніка!

Але, скажу я вам, пасада наша мае і свае вартасці. Хто на прыгажосць зямную больш за ўсіх глядзіць? Вартаўнік! Дзень за днём, год за годам сочым мы, як сонца ўстае. А прыгажосць гэтая заўсёды ў сэрца западае. Вось вы скажаце, якое бывае сонца на золаку ў чэрвені? А які месячык ясны, калі мароз пачынае ціснуць? Тады ён маленькі, празрысты, як наліўное яблычка, яркім блакітам зяе. А які месяц летам, парнай, душнай ноччу? Не ведаеце? А ён жа той парою чырвоны, распараны, як пасля лазні. А надвор'е прадказаць хто лепш зможа? Куды таму бюро надвор'я! Вось вартаўнік — іншая справа, ніколі не памыліцца. У сенажаць ды жніво наш старшыня толькі да мяне і звяртаецца: «Даражэнькі Селівон, ці будзе сёння дождж?» А я яму, як па-пісанаму: «З ранку пачне хмурыцца, а к поўдню і палье...» І не памыляўся. Падзякі атрымліваў.

А хто больш за вартаўніка думае? Мусіць, не дарэмна і вучоныя адкрыцці ноччу робяць... Ведама: ноч, цішыня, думкі так і наплываюць. Нішто ім не перашкаджае...

І ўсё ж, скажу вам, вырашыў я адмовіцца ад сваёй пасады. Праўду кажу. Буду гаварыць па-парадку. Якая пасада шкоду чалавечай свядомасці робіць? Пасада вартаўніка! Чаму, спытаеце? А вось памяркуйце самі. Мы будуем камунізм. А што гэта такое? Гэта ў першую чаргу — высокая свядомасць кожнага нашага чалавека. Паглядзіце. Брыгады камуністычнай працы — што гэта? Свядомасць. Чалавек адмаўляецца ад сваёй аўтамашыны ці дачы... Зноў-такі, свядомасць! Грамадскія клубы, кнігарні, бюро канструктарскія... Ды навошта далёка хадзіць! На нашай ферме ўжо дзве брыгады камуністычнай працы, увесь калгас за гэтае высокае званне змагаецца... А я хаджу ноччу і падбухторваю сам сябе: «Не вер, Селівон! Злодзей маскіруецца. Хоча ў цемры прынесці шкоду гаспадарцы!» І так растрывожу сябе, што сам не свой хаджу. І горш за ўсё тое, што за цэлы год няма ніводнага выпадку крадзяжу. Радавацца б трэба, а я папракаю сябе: «Старэеш, Селівон, вочы твае пільнасць страцілі. Дарэмна калгасны хлеб ясі». Мусіць, і сапраўды пасада мая непатрэбная, шкодная. А ўчора? Смех ды й годзе! Думаў — злавіў, нарэшце, злодзея! Злодзеі, каб іх качкі з'елі! Пасля ўчарашняга катэгарычна адмаўляюся ад пасады. Што здарылася, кажаце? А вось паслухайце...

Была якраз нядзеля. У клубе вечарынка, моладзь полькі таўчэ. Выбраў я сабе месца недалёка ад клуба, сяджу, слухаю, гукі начныя лаўлю. Цішыня наўкол, толькі і ёсць гуку, што ў клубе, ды зрэдку дзе-небудзь сабака цяўкне. Раптам — чую чвякае, хтосьці ідзе. Прыслухаўся: размаўляюць, амаль шэптам, бо слоў не разбіраю. Нікога не бачна, але чую, што крокі ў бок фермы падаліся. Каго гэта туды ў такі час нясе? Як ацёлы, дык заатэхнік ды даяркі на дзяжурствы ходзяць. Але ж да ацёлаў яшчэ далёка. Пасунуўся ціхенька следам за чвяканнем. Двое наперадзе ідуць, па галасах мяркую: адзін дзявочы, другі мужчынскі. Хто ж гэта, думаю?

Дайшоў да кармакухні. Яны — таксама туды. Ага, думаю, не дарэмна, ведаеце, што там мука, бульба, камбікармы захоўваюцца. Потым чую —замок бразнуў, ён там толькі для блізіру. Ведаюць жа, нягодніки! Ну, думаю, зараз на месцы злачынства і накрыю.

Прыклаў вуха да дзвярэй, слухаю. Шукаюць ліхтар. Такой нахабнасці не чакаў: красці пры святле. Расчыняю я дзверы і:

— Рукі ўверх!

Дубальтоўку для страху наставіў.

І што б вы думалі! Гляджу, а яны цалуюцца. Хлопец за кормазапарнік сіганў, а дзяўчына — разгубілася:

— Дзядзька Селівон!

Цьфу ты, каб цябе паляруш! Стаіць перад мной Ксана, даярка наша.

— Што тут табе трэба ноччу? — пытаю строга.

— Вечарам Бурка — рэкардсменка наша — вады чамусьці не піла, дык трэба ёй пойла цёплага даць. Ды й паглядзець, што з ёю...

— А там хто схаваўся? А ну, выходзь!

Выходзіць — Максім, мой меншы сын, апраўдваецца:

— Ксюшу праводзіў, цёмна, гразка...

Цяпер вось мяркуйце самі, шкодная мая пасада ці не шкодная, вельмі яна патрэбная ці не вельмі... А што буду рабіць, пытаеце? Яшчэ не стары. Думаю, што занятак у гаспадарцы знойдзецца, калі рукі па рабоце сумуюць.

Васіль МАТЭВУШАЎ

Роднае

Не буду пярэчыць: прырос,
Напэўна, навекі ўлюбёным,
Да гнёздаў буслініных, бяроз,
Да ніў, пералескаў зялёных.
Да сцежак ласіных і зор,
Да родных крыніц яснавокіх...

І мне магілёўскі прастор
Прасцёрся Радзімай шырокай.

На золаку

Калі зара агнём засвеціць
Над цёмнай пушчай за сялом,
Я ведаю, што ёсць на свеце
Не толькі ўтульны, цёплы дом.

А над далінаю і рэчкай
Мяне чакае золь дажджоў,
І можа вецер бессардэчны
Адлупцаваць з усіх бакоў.

Ды ў жыцці салодка, мірна
Вясны світанне не прасплю:
Я чую ў засеках, у свірнах —
Насенне просіцца ў зямлю.

І толькі хай усход засвеціць —
Мой след праляжа за сялом.
Каб самым цёплым быў на свеце
Вялікай бацькаўшчыны дом.

Віктар ГАЛАЙДА

Практыкантка

Загулі правады ад ветру,
У бальніцы звінеў тэлефон:
У пасёлку, за пяць кіламетраў,
Паміраў паштальён.
Што рабіць? Ні ўрача, ні «хуткай»...

Практыкантка маўчыць...
Толькі голас здалёк у трубку
Патрабуе, крычыць.
«Еду!» — раптам яна сказала,
Рэчы ўсе узяла,
Паспешліва напісала:
«Я на выклік пайшла».
Снег па твары сячэ, бы шротам,
Вецер звальвае з ног,
Гарбылямі ляглі сумёты —
Ні сцяжын, ні дарог.
Ступіш крок і ляціш, бы ў яму...
«Мо вярнуцца назад!..»
Толькі не! Помніш, Каця, як мамы
Ратавалі салдат!
Пад снарадамі маці таксама
Адганяла бяду.
Шэпчуць губы дзяўчыны: «Мама,
Я таксама дайду!..»
Гоніць вецер віхуры шмацце
Ад сяла да сяла.
За жыццё чалавека змагацца
Практыкантка ішла.

Васіль КАРПЕЧАНКА

Вясна

З кудзелі пабурэлай снежнай
Прадуцца ніці-раўчукі.
І тчэцца, шырыцца бязмежна
Тканіна вод каля ракі.

Здаецца, жаўранак у неба
Зямлю падняў бы, калі б мог.
Ад цеплыні дыміцца глеба,
Як з печы выняты пірог.

Струной разбуджанай паветра
Звініць, пяе на ўсе лады.
Вось-вось і сонейку прыветна
Лісцём запляскаюць сады.

Сямён ПАЦЁМКІН

Над Дняпром

Тут гарады, Дняпра сівога дзеці,
Ад спёкі тонуць у вянках садоў;
А ў тых садах бушуе квецень,
Нібы ў шаўкі прыбраў іх Магілёў.

І з першым промнем, на світанку,
Плыве штодзённы гул і перазвон.
А запяюць мае магіляўчанкі —
І песня возьме кожнага ў палон.

Іх песні любіць сам Дняпро шырокі:
Сціхаюць хвалі, травы, лазнякі.
Над ім бялеюць кужалем аблокі,
Нібы дняпранкі сушаць ручнікі.

Два разы на месяц збіраюцца на літаратурныя серады члены літаратурнага аб'яднання пры газеце «Магілёўская праўда». Адно з пасяджэнняў было прысвечана абмеркаванню твораў пачынаючых літаратараў Крычаўскага раёна. У ім прынялі ўдзел (злева направа) Васіль Лук'янчык, Васіль Матэвушаў, Апанас Палітыка, Анатоль Канапелька, Аляксей Пысін і Пятро Шасцерыкоў.

Фота А. КАНДРУСЕВІЧА.

ДЛЯ ДУШЫ...

Ну, якая без баяна ці гармоніка вечарынка ў калгасе? Нездарма кажуць: баяніст — першы хлопец на вёсцы. Вось і гэтыя хлопцы — Пётр Хацько, Баляслаў Шуменка і Канстанцін Белагур мараць так навучыцца іграць, каб пераборамі іх баянаў заслухоўваліся дзяўчаты ў ціхія летнія вечары. Таму і ходзяць яны сюды, у Дом народнай творчасці, да Леаніда Васільевіча Сартанова — выкладчыка класа баяна. Многіх навучыў ён майстэрству ігры на любімым народным інструменце. Сем год існуюць пры Доме творчасці курсы калгасных баяністаў, і ў кожны новы набор шмат жадаючых паступіць вучыцца.

З кінакамерай па рэспубліцы

Мы ў камунізм трымаем крок! — пад такім дэвізам праходзіў нядаўна ў Мінску другі рэспубліканскі злёт ударнікаў камуністычнай працы. Яму і прысвячаецца першы сюжэт кіначасопіса «Савецкая Беларусь» № 16 вытворчасці Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў.

Выклічуць цікавасць у гледачоў кінакадры аб будаўніцтве непадалёку ад Гродна воданапорнай станцыі, якая ўвойдзе ў буйны комплекс азотнатукавага завода, аб новай машыне Інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі нечарназёмнай зоны СССР і інш.

Асобны кінасюжэт прысвечаны заканчэнню навучальнага года ў школах рэспублікі.

Затым гледачы пабываюць у Гродзенскім заапарку, папрысутнічаюць на коннаспартыўных спаборніцтвах пад Мінскам, у якіх прымалі ўдзел каманды Арменіі, Беларусі, Кіргізіі, Латвіі.

У заключэнне кіначасопіса паказаны ўрыўкі з камедыі «Небяспечны ўзрост» у выкананні артыстаў Маскоўскага тэатра імя Ленінскага камсамола.

ДЗЕЦІ ПАКАЗВАЮЦЬ

Дзіцячы тэатральны калектыў Палаца культуры гомельскіх чыгуначнікаў існуе каля шасці год. Толькі за апошні час юныя артысты падрыхтавалі і паказалі спектаклі «Самбрэра» С. Міхалкова і «Пецька ў космасе» І. Дзік.

Гэтымі днямі ўдзельнікі дзіцячага тэатральнага калектыву пазнаёмілі школьнікаў Гомеля са сваёй новай работай — спектаклем «Сябра мой, Колька» па п'есе А. Хмеліка.

АРЫГІНАЛ І РЭПРАДУКЦЫЯ

Мастацкая рэпрадукцыя... Многа яна можа расказаць гледачу аб жывапісных палотнах, скульптурных кампазіцыях і графічных лістах, што знаходзяцца ў дзяржаўных музеях і карцінных галерэях або экспануюцца на выстаўках.

Каб пазнаёміць шырокія масы аматараў выяўленчага мастацтва з найбольш выдатнымі творамі класічных і сучасных майстроў, у рэспубліцы выпускаюцца альбомы, паштоўкі з рэпрадукцыямі карцін, скульптур, малюнкаў. Імі ахвотна ўпрыгожваюць свае кватэры працоўныя. Вучні і настаўнікі ствараюць з іх школьныя «Траццякоўкі».

Вялікую ролю ў папулярызацыі выяўленчага мастацтва адыгрываюць часопісы. Яны змяшчаюць разнастайныя рэпрадукцыі, якія знаёмяць працоўных з творчасцю нашых майстроў.

Многа зрабіў часопіс «Беларусь». На яго старонках рэгулярна друкуюцца рэпрадукцыі, у тым ліку каляровыя, з карцін класікаў-жывапісцаў і сучасных мастакоў. Хоць рэдакцыя не мела раней вопыту ў гэтай справе, аднак, старанна і рупліва ўзяўшыся за яе, дасягнула пэўных поспехаў. У часопісе мы сустракаем рэпрадукцыі, выкананыя з добрым мастацкім густам і прафесіянальным майстэрствам. Сярод іх: «Вёска» М. Беляніцкага, «Калгасныя агні» С. Лі, «Радасць ураджаю» А. Шыбнёва і інш.

Разам з гэтым ёсць і невыразныя, недабраякасныя рэпрадукцыі. Вось каляровая рэпрадукцыя карціны Я. Зайцава «Над Прыпяццю». Гэта — адзін з лепшых твораў беларускага пейзажнага жывапісу. Што ж мы бачым у часопісе? Цёмна-карычневыя і зялёныя плямы. Тое ж самае можна сказаць пра рэпрадукцыі, зробленыя з класічных твораў — «Новы Рым» С. Шчадрына (№ 10 за 1960 г.), «Месячная ноч у Пецярбургу» М. Вераб'ёва (№ 11 за 1960 г.). На першай відаць толькі цёмныя абрысы прадмета, на другой замест месячнай ночы — рознакаляровае зарыва.

Клішэ шматкаляровых рэпрадукцый для часопіса «Беларусь» рыхтуюцца ў Маскве і адпавядаюць высокім тэхнічным патрабаванням. Пратраўліванне, адбіткі і карэкціраванне колеру робяцца ў Мінску. Значыць, гэтыя далейшыя працэсы залежаць цалкам ад пратраўшчыка і карэкціроўшчыкаў колеру. Карэкціроўшчык — таксама мастак, ён павінен мець вялікі вопыт і валодаць высокім прафесіянальным майстэрствам, каб умець правільна вызначыць, які іменна колер і якой інтэнсіўнасці найбольш падыходзіць, каб зрабіць адбітак, падобны да арыгінала. На жаль, цынкографам, якія робяць клішэ для часопіса «Беларусь», пакуль што яшчэ не хапае такога майстэрства.

А чаму б, скажам, не паслаць нашых цынкографаў для павышэння кваліфікацыі на трохмесячныя курсы, якія існуюць у Маскве? Вядома, для таго, каб цалкам авалодаць высокім майстэрствам каляровай паліграфіі, патрэбны гады. Але ніхто не будзе адмаўляць, што курсы могуць таксама даць нямала. Гэта пацвярджае стан рэпрадукцый часопіса «Маладосць», цынкографы якога вучыліся на гэтых курсах. Паліграфісты, якія працуюць у «Маладосці», імкнуцца не толькі дакладна перадаць колер таго ці іншага твора, але і выявіць самую фактуру пісьма мастака.

Праўда, нават у часопісе «Маладосць» насычанасць колеру ў адбітку звычайна менш інтэнсіўная, чым у арыгінале твора. Сустракаюцца і тэхнічныя заганы ў надрукаваных рэпрадукцыях. Напрыклад, карціну «Восень» В. Жолтак у часопісе (№ 9 за 1961 г.) нельга пазнаць. На ёй многа жаўцізны, у многіх месцах парушаны колер. У выніку ўвесь твор страціў сваю выразнасць.

Аб тым, што беларускім цынкографам трэба павышаць і ўдасканальваць сваё майстэрства, гаворыць яшчэ адзін прыклад.

Летась Дзяржаўнае выдавецтва БССР выпусціла альбом беларускага жывапісу, куды ўвайшло 67 рэпрадукцый. Гэта была першая самастойная каляровая работа беларускіх паліграфістаў. Трэба сказаць, што ў альбоме шмат удалых рэчаў. Сярод іх: «Партызаны ў разведцы» Я. Ціхановіча, «Ранак» Я. Радзялоўскай, «Песня» М. Савіцкага, «Жаночы партрэт» М. Гусева і інш.

На жаль, побач з дабраякаснымі рэпрадукцыямі мы зноў сустракаем дрэнныя. Недахопы тыя ж самыя: неадпаведная арыгіналу інтэнсіўнасць колеру, няправільна перададзеная каляровая гама. Гэта тлумачыцца тым, што рэпрадукцыі выраблялісь спосабам высокага друку. Пры гэтым спосабе ўзнікае вельмі вялікі кантакт паміж друкарскай формай і самім матэрыялам. Вось чаму роля карэкціроўшчыкаў і асабліва пратраўшчыкаў тут вельмі істотная. Варта дадаць лішнюю фарбу і недакладна пракарэкціраваць, як рэпрадукцыя адразу атрымаецца недабраякаснай.

Здавалася б, тыя хто выпускаў мастацкі альбом, павінны былі ўлічыць усе гэтыя недахопы ў далейшай рабоце.

Аднак гэтага не здарылася. Тыя ж самыя памылкі і, трэба сказаць, у яшчэ большай ступені паўтарыліся пры выпуску камплекту паштовак «Творы рускага жывапісу з экспазіцыі Дзяржаўнага мастацкага музея БССР». Друкаваліся яны спосабам афсетнага друку. Гэты спосаб адрозніваецца ад папярэдняга тым, што паміж друкарскай формай і матэрыялам для друкавання ляжыць спецыяльная гумавая пракладка, якая змякчае пры друкаванні празмерную інтэнсіўнасць фарбы. Але гэты спосаб прыгодны пры рэпрадуктаванні не ўсіх карцін. Нас задавальняе, напрыклад, паштоўка з творам С. Жукоўскага «Інтэр'ер». Аднак паштоўкі з работамі Н. Рэрыха, А. Рылова, А. Архіпава вельмі невыразныя. А такія, як «Балгарскія пакутніцы» К. Макоўскага, «Чаяпіцце» В. Макоўскага, «Палессе» І. Шышкіна гаворыць аб тым, што карэкціроўшчыкі несур'ёзна паставіліся да сваёй справы. Дрэнна зроблена і вокладка камплекту. Яна чамусьці атрымалася зусім бясколернай. Праўда, на паліграфічным камбінаце імя Я. Коласа своечасова зразумелі сваю памылку і вырашылі значную частку паштовак (больш шасці тысяч) перарабіць нанава.

Усе гэтыя факты сведчаць аб адставанні беларускіх паліграфістаў у справе выпуску прадукцыі выяўленчага мастацтва. Каб наладзіць вытворчасць рэпрадукцый у рэспубліцы, неабходна абавязкова запрасіць у Мінск вопытных маскоўскіх спецыялістаў, якія памаглі б нашым цынкографам павысіць сваю кваліфікацыю і па-сапраўднаму авалодаць складаным працэсам пратраўлівання і карэкціроўкі.

Р. БАДЗІН.

АПОСТАЛ ЧАЛАВЕЧАЙ СВАБОДЫ

ДА 250-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЖАН ЖАКА РУСО

Тры вялікія тамы ў бледна-зялёных вокладках... Гэта — збор выбраных твораў Жана Жака Русо, выпушчаны Дзяржаўным выдавецтвам мастацкай літаратуры. Ён уключае не толькі славутую «Новую Элаізу» і «Споведзь», але таксама — «Эміль, або Аб выхаванні», творы Русо аб тэатры і музыцы, яго трактаты аб прычынах паходжання няроўнасці і аб грамадскім дагаворы, што адыгралі ролю маніфестаў Вялікай Французскай буржуазнай рэвалюцыі 1789 года. Гэтыя тры тамы выйшлі тыражом у 100 000 экземпляраў кожны.

Не так даўно з'явіўся зборнік артыкулаў і пісем Русо па пытаннях тэатра, музыкі, мовы, а таксама выдатная манаграфія аб вялікім жэнеўскім грамадзяніне, напісаная Ізраілем Верцманам, адным з лепшых савецкіх знаўцаў заходняй літаратуры XVIII стагоддзя.

Ці выпадковая такая цікавасць да Жана Жака Русо? Наўрад. Я лічу глыбока знамянальным тое, што ў нашай краіне яго ведаюць, чытаюць, вывучаюць. Бо Русо належаў да ліку тых вялікіх людзей, чые думкі былі прысвечаны ідэі прагрэсу чалавечага жыцця.

Многае з таго, пра што пісаў Русо, і да гэтага часу хвалюе людзей. Перш за ўсё — гэта пытанні сацыяльныя.

Жан Жак Русо быў апосталам чалавечай свабоды. Кожны чалавек і кожны народ мае натуральнае права на свабоду. Гэта простая і вялікая ісціна... Калі рабаўласніцкае і феадальнае грамадства стагоддзямі стварала ідэалогію, згодна якой рабства, прыгонніцтва, пакорнасць абвяшчаліся законным лёсам амаль усяго чалавецтва, дык Русо смела адмёў гэта як няпраўду, якая пярэчыць законам прыроды. Прырода стварае людзей роўнымі. Грамадства нараджае саслоўную і класавую розніцу паміж імі.

Вядома, што Русо зрабіў з гэтага парадаксальныя вывады. Калі цывілізацыя стварае няроўнасць, дык далоў цывілізацыю! Назад да прыроды! Там, на ўлоні яе, будзе набыта роўнасць і будзе дасягнута свабода.

Парадаксальнасць Русо была ў тым, што ў імя свабоды ён гатовы быў — у прынцыпе — адмовіцца нават ад заваёў і дасягненняў культуры. Ён адмаўляў значэнне культуры, калі яна недаступная народу.

У парадоксах Русо былі закладзены ісціны вялізнай выбуховай і рэвалюцыйнай сілы. Ніхто да яго не здолеў з такой рэзкасцю падкрэсліць супярэчнасці развіцця цывілізацыі і культуры. З аднаго боку, прагрэс законаў, грамадзянскіх устанаўленняў, навукі, культуры, а з другога, рэгрэс, усё большае заняволенне чалавецтва.

— Што важнейшае для чалавека? — пытаўся Русо, — здабыткі цывілізацыі і культуры ці свабода? — Адказ жэнеўскага мысліцеля быў недвухсэнсоўны: свабода!

Вядома, Русо не быў абскурачтам, які патрабаваў «закрыцця» навук. Парадаксальная была толькі форма выказвання яго ідэі аб неабходнасці вызвалення чалавецтва. І трэба прызнаць, што жахлівыя, ненармальныя ўмовы прагрэсу не толькі ў тую эпоху, але і ў нашу прыводзілі да такіх аднабаковых вырашэнняў кардынальных праблем развіцця чалавецтва.

Супярэчнасці цывілізацыі дасягнулі ў нашу эпоху яшчэ большага развіцця, чым гэта было ў часы Русо. Чалавецтва вынайшла цяпер сродкі, якія ствараюць пагрозу існаванню самога жыцця на зямлі. Гэта нарадзіла нямала ўсялякіх песімістычных тэорый. Цяпер таксама ёсць людзі, якія лічаць, што ад няшчасцяў сучаснай цывілізацыі трэба шукаць ратунку ў звароце да прыроды, да прымітыўных форм быцця.

Але паміж гэтымі людзьмі і Жанам Жакам Русо няма нічога агульнага. Для Русо яго славуты лозунг звароту да прыроды быў сінонімам прынцыпу свабоды. Перадавая сацыяльная думка сучаснасці таксама сцвярджае, што вырашэнне супярэчнасцей, якія пагражаюць чалавецтву, патрабуе, перш за ўсё, зацвярджэння ў жыцці найбольш свабодных грамадскіх устанаўленняў. Наш век — гэта век усеагульнага абуджэння народаў, якія імкнуцца да сваёй свабоды і свабоды ўсяго чалавецтва. Вялікая ідэя нашага стагоддзя — гэта ідэя ўсеагульнай роўнасці: роўнасці сацыяльнай і эканамічнай, роўнасці рас і нацый, роўнасці полаў, роўнасці грамадзянскай. Чалавецтва ідзе да ажыццяўлення гэтага ідэалу складанымі шляхамі, але яно ўсё ж рухаецца ў гэтым напрамку, з якога ўжо нішто не зрушыць яго.

Культура і грамадскі прагрэс. Наш век інакш вырашае гэтую праблему, чым век Русо. Жэнеўскі мысліцель жыў у эпоху яшчэ вельмі не развітай тэхнікі. Сучаснае чалавецтва мае ў сваім распараджэнні тэхніку і крыніцы энергіі, якія дазволяць значна палегчыць працу людзей. Чалавек не хоча быць больш рабом прыроды. Ён становіцца яе гаспадаром. Ён вырваў у прыроды ўжо многія яе тайны і ведае сакрэты, якія ператвараюць подзвігі Геркулеса ў дзіцячыя забавы. Свабодны чалавек, які валодае ўсімі сучаснымі сродкамі, узятымі ў прыроды для пакарэння яе нашым патрэбам, — такі ідэал нашага часу.

Мы не спрачаемся з Русо і не папраўляем яго. Яго паправіла сама гісторыя. Але трэба спрачацца з тымі, хто на самай справе хацеў бы вярнуць чалавецтва да першабытнага стану. Вядома, варварства і дзікасці нямала яшчэ і ў наш век. Але новых форм цывілізацыі і дасягненняў культуры наш час ведае непамерна больш, чым іх ведаў у свой час Русо.

Не назад да прыроды, а наперад разам з ёю — вось максіма прагрэсу нашай эпохі. Людзі не толькі раскавалі раней затоеныя сілы прыроды, яны рвуць і тыя ланцугі, што скоўвалі іх грамадскае і нацыянальнае развіццё. Праз кроў і пакуты XX век ідзе да ўсё большага вызвалення чалавецтва ад усялякіх форм прыгнечання і рабства.

Калісьці Русо ўяўляў сабе, што самымі ідэальнымі былі б маленькія дзяржавы-рэспублікі, накшталт гарадоў-дзяржаў старажытнай Грэцыі. Цяпер гэта ўжо немагчыма. У арбіту ўсеагульнага жыцця ўцягваецца ўвесь зямны шар. Лёс народаў узаемапераплецены. Ва ўсяго чалавецтва цяпер агульны лёс. Яно павінна знішчыць перашкоды, якія стрымліваюць прагрэс і аб'яднанне народаў пад вялікімі лозунгамі міру і дружбы, свабоды і роўнасці, сацыяльнага прагрэсу.

Але калі перад чалавецтвам стаяць калектыўныя задачы сапраўды сусветнага значэння, гэта не выключае клопатаў пра тое, што асабліва хвалявала Русо, — клопатаў пра кожную чалавечую асобу.

Старое ўяўленне пра Русо як пра аднаго з вестуноў індывідуалізму ніколі не было правільным. Так, аўтар «Споведзі» і «Эміля» лічыў найвышэйшым дабром развіццё асобы кожнага. Але не на шкоду і не ў процівагу грамадству, а ў гарманічным адзінстве з ім. Таму вялікі філосаф XVIII веку і не мае нічога агульнага з сучаснымі вестунамі антыграмадскага індывідуалізму. Адчуванне сувязі чалавека з сабе падобнымі, высока развіты сацыяльны інстынкт, пачуццё сваёй агульнасці з іншымі людзьмі, усведамленне маральнага абавязку перад імі — пра ўсё гэта Русо расказаў нам і ў сваіх тэарэтычных творах і ў раманах.

Русо быў і застаецца для ўсяго чалавецтва носьбітам лепшых грамадзянскіх і асабістых ідэалаў. Ён — прадвеснік свабоды, роўнасці і любві людзей адзін да аднаго. Наш век больш за ўсё мае патрэбу ў тым, каб гэтыя ідэалы сталі рэальнасцю. Мы не верым тым сучасным філосафам і пісьменнікам, якія сцвярджаюць, што чалавек чалавеку — вораг, што людзі разбэшчаныя і брыдкія па самой сваёй прыродзе, што яны здольныя толькі знявечыць жыццё і нашу планету. Разам з Русо мы верым і ў высакароднасць чалавечай прыроды. Так, ненармальныя ўмовы няроўнасці і прыгнёту калечаць натуру чалавека, але свабода адраджае ў ім яго лепшыя задаткі і развівае іх.

Змрочным прадказальнікам гібелі чалавецтва мы процівастаўляем веру ў прагрэс і ідэалы. Вось чаму такі пісьменнік і мысліцель, як Жан Жак Русо, патрэбен нашаму часу і вось чаму ён знаходзіць сабе чытачоў у нас. Русо быў барацьбітом. Дзякуючы яму чалавецтва зрабіла некалькі крокаў наперад па шляху сацыяльнага прагрэсу. Такія заслугі не забываюцца. Але шлях далёка яшчэ не пройдзены. Свету патрэбен мір, каб чалавецтва дамаглося свабоднага і прыгожага жыцця.

Аляксандр АНІКСТ.
(АДН).

ПЕРАД ГЛЕДАЧАМІ МАСКВЫ

Народны ансамбль танца пры Віцебскім раённым Доме культуры карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод працоўных вобласці. Гэта не выпадкова. Удзельнікі народнага ансамбля — вялікія аматары самадзейнага мастацтва. І таму танцы ў іх тэмпераментныя, хвалюючыя. З аднолькавай цікавасцю і задавальненнем глядзяцца танцы «Воранаўская кадрыля», «Беларуская полька», венгерскі танец «Чардаш», румынскі — «Брэў». Добрымі танцорамі паказалі сябе Анатоль Асіпенка, Яфім Брусер, Ларыса Раманенка, Мікалай Скакун, Святлана Бараноўская і многія іншыя.

Нядаўна пры ансамблі была створана сольная група спевакоў, у якую ўвайшлі Канстанцін Залатухін, Ася Мінаева і Надзея Мельнікава. Удзельнікі ансамбля часта выступаюць перад працоўнымі Віцебска і вобласці. Днямі танцавальны калектыў выязджае ў Маскву. Артысты народнага ансамбля выступяць з канцэртам перад наведвальнікамі Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі.

КЛУБ на самаабслугоўванні

«Перавесці клуб на самаабслугоўванне», — вырашылі камсамольцы саўгаса «Нясята» Клічаўскага раёна. Быў створаны савет клуба. Паміж членамі савета размеркаваны абавязкі. І справы ў клубе пайшлі куды лепш. Кожны дзень тут праводзіцца якое-небудзь цікавае мерапрыемства. Арганізаваны бібліятэчкі-перасоўкі, якія абслугоўваюць рабочых, што жывуць далёка ад саўгаснага цэнтра. Створаны гурткі мастацкай самадзейнасці.

Добрая ініцыятыва камсамольцаў саўгаса «Нясята» знайшла паслядоўнікаў. Цяпер шэраг калгасных і саўгасных клубаў Магілёўскай вобласці пераходзяць на самаабслугоўванне.

Сцежка праз Нарач.

Фота Ю. ГАРУЛЁВА.

ЗАРУБЕЖНЫЯ НАВІНЫ

СЕНСАЦЫЯ ПАРЫЖСКАГА ЛЕТА

Увечары 18 чэрвеня ў парыжскім тэатры «Сары Бернар» адбылася новая сустрэча артыстаў Малога тэатра з французскімі гледачамі. Быў паказаны спектакль «Калегі» — інсцэніроўка аповесці маладога савецкага пісьменніка Васіля Аксёнава.

Карэспандэнт АДН пазваніў у Парыж. Да тэлефона падышоў вядомы савецкі рэжысёр Барыс Равенскіх, пастаноўшчык «Улады цемры», паказанай днямі парыжанам.

— Як прайшлі першыя спектаклі Малога тэатра ў Парыжы?

— Цудоўна, — гаворыць Барыс Равенскіх. — Я асабліва рад поспеху Барыса Бабачкіна і Віктара Каршунова — пастаноўшчыкаў «Калег». Востры спектакль на сучасную тэму сустрэў гарачы прыём у парыжан.

Думаю, што спектаклі Малога тэатра надалі асаблівае гучанне Міжнароднаму тэатральнаму фестывалю, арганізаванаму Тэатрам нацый. Я адчуваў сапраўдны гонар за савецкае тэатральнае мастацтва, за нашых выдатных артыстаў і рэжысёраў.

— А як прымалі «Уладу цемры»?

— Дастаткова сказаць, што заслону давялося ўзнімаць адзінаццаць разоў! Перад пачаткам спектакля савецкіх артыстаў прадставіў парыжанам Жан-Луі Баро, адзін з кіраўнікоў Парыжскага драматычнага тэатра.

— Але ж Жан-Лві Баро цяпер у Маскве?

— Так, ён спецыяльна пазваніў у Парыж і папрасіў перадаць гледачам, каб яны аказалі савецкім артыстам такі ж цёплы прыём, які масквічы аказваюць яго тэатру. Але я думаю, што апладысменты парыжан былі не толькі абавязкам ветлівасці... На вачах многіх гледачоў я бачыў слёзы. Пасля спектакля да мяне падышоў сын вядомага рускага пісьменніка Леаніда Андрэева — Валянцін Андрэеў. Я быў рады паведаміць яму, што п'есы яго бацькі шырока выдаюцца ў Савецкім Саюзе, а «Дні нашага жыцця» ставіць тэатр імя Пушкіна, якім я цяпер кірую.

За кулісы пасля спектакля нас прыйшлі павіншаваць французскія артысты і рэжысёры, але іх было так многа, што ўсіх прозвішчаў я, на жаль, не запомніў...

Касы тэатра «Сары Бернар» асаджаюць парыжане, нягледзячы на параўнальна высокую цану білетаў. Усяго ў Парыжы мы пакажам восем спектакляў. Ва ўчарашніх газетах ужо з'явіліся першыя захапляючыя рэцэнзіі, інтэрв'ю з рэжысёрамі і акцёрамі.

СВЯТА ФАТАГРАФІІ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ КРАІН

У Празе адкрылася выстаўка фатаграфій інфармацыйных агенцтваў сацыялістычных краін. 360 выстаўленых работ — гэта ў асноўным рэпартажныя здымкі. Яны насычаны дынамікай і дыханнем сучаснасці, праўдзіва паказваюць, як жывуць народы, якія будуюць новае грамадства.

13 работ прэміраваны. Іх спіс узначальвае твор венгерскага фотарэпарцёра К. Патко (МТІ) «Савецкая маці ля магілы сына, які загінуў за вызваленне Венгрыі». Першую прэмію з ім падзяліў кубінскі карэспандэнт Джорджэ Олер за мастацкае фотапаслатно, якое адлюстроўвае масавы народны мітынг у Гаване.

Другую прэмію атрымаў савецкі фотарэпарцёр Яўгеній Ціханаў (агенцтва друку Навіны) за работу «Сігналы з Сусвету».

Прэміі таксама атрымалі чэхаславацкі фотарэпарцёр І. Шарох (ЧТК), савецкія фотакарэспандэнты М. Рэдзькін (ТАСС), Ю. Абрамачкін, В. Шустаў (агенцтва друку Навіны).

ЕВА ЛАНТАШ ПАЕДЗЕ Ў СССР

У школах Венгрыі штогод наладжваюць конкурсы па асобных дысцыплінах. Пераможцам Усевенгерскага конкурсу па рускай мове сёлета стала вучаніца Сольнакскай гімназіі Ева Ланташ. Ей уручана прэмія, а таксама дакумент на права паступлення ў любую вну краіны без прыёмных экзаменаў.

Ева Ланташ атрымала і яшчэ адну перамогу: яна заняла першае месца на конкурсе чытачоў савецкай літаратуры, аб'яўленым Таварыствам венгра-савецкай дружбы. Прыз конкурсу — турысцкая паездка ў Маскву, Кіеў і Сочы.

(АДН).

ЦІ ЎСЁ МЫ ВЕДАЕМ ПРА СКАРЫНУ?

З АРХІЎНЫХ ПАЛІЦ

За апошнія трыццаць год, дзякуючы новым матэрыялам, выяўленым у архівах Вільні, Прагі, Познані, нашы звесткі пра вядомага беларускага вучонага — гуманіста і першадрукара Георгія-Францішка Скарыну — значна пашырыліся. У той жа час гэтыя матэрыялы даюць падставу зрабіць вывад, што шматгранная дзейнасць Скарыны яшчэ далёка не вывучана. Нам мала што вядома аб яго занятках у галіне «сямі навук вызваленых», а таксама медыцыны і батанікі. Нельга нават з упэўненасцю сцвярджаць, што выдавецкая дзейнасць Скарыны абмежавалася выданнем толькі 23 біблейскіх кніг, «Апостала» і «Малой падарожнай кніжыцы», якія захаваліся да нашых дзён.

Найбольш поўна скарынінскія выданні прадстаўлены ў Брытанскім музеі ў Лондане. Але, паводле архіўных дадзеных, і там знаходзіцца не ўсё. Даследчыкам, напрыклад, вядомы толькі «Апостал» Скарыны віленскага выдання 1525 г. А між іншым, у рукапісным аддзеле Вільнюскага універсітэта ёсць указанні і на ранейшыя выданні «Апостала», указанні, якія дае ў адным са сваіх рукапісаў вядомы бібліёграф Пылка Палінскі: «1519. Апостол; 1522. Skoryna. Апостолъ» (Гл. Бібліятэка Вільнюскага універсітэта, аддзел рукапісаў. ДС 210. P. Polinski. Notaty do bibliografii chronologicznej 1509—1814 л. 1 аб.).

На першы погляд можа паказацца, што П. Палінскі дату выдання «Апостала» Скарыною перадае недакладна. Аднак уважлівае вывучэнне рукапісу сведчыць аб тым, што аўтар яго, добра ведаючы ўсе віленскія і іншыя беларускія выданні, правільна датуе іх. Гэта, у прыватнасці, датычыць выданняў П. Мсціслаўца, С. Буднага, Л. Зізанія, А. Воляна, М. Чаховіча, М. Сматрыцкага і іншых. Аб гэтым можна меркаваць і па тым, што літаральна на другой старонцы свайго рукапісу П. Палінскі яшчэ раз памецію: «1525. Skoryna. Деяния и послания» (гэта значыць «Апостал». — **М. А.**). І далей: «1525. Skoryna. Каноник или Ака(фист), Псалтиръ, Часослов» і насупраць прыпіска: «I. Babicz», што азначае — выдадзены ў доме віленскага бургамістра Якуба Бабіча, як на гэта ўказваў і сам Скарына.

Відавочна, калі б П. Палінскі меў на ўвазе толькі вядомае ў наш час віленскае выданне «Апостала» (1525), то ён не стаў бы заносіць у свой рукапіс гэтую кнігу тройчы. Дзеля таго, каб зрабіць такі запіс, ён павінен быў мець у сваіх руках розныя выданні скарынінскага «Апостала». А з гэтага вынікае, што «Апостал» Скарыны вытрымаў тры выданні (1519, 1522, 1525 гады).

На падставе паведамлення П. Палінскага можна зрабіць яшчэ адзін вывад: «Малая падарожная кніжыца» Скарыны, дата выдання якой да апошняга часу дакладна не была вядома (згодна меркавання Ст. Эстрэйхера, каля 1526—1527 гг.), выйшла ў свет у 1525 годзе, бо «Каноник или Ака(фист), Псалтиръ. Часослов» ёсць не што іншае, як састаўныя часткі «кніжыцы».

Як вядома, даследчыкі ніяк не маглі растлумачыць той факт, што Скарына пасля выдавецкай дзейнасці ў Празе (за тры гады ім былі там надрукаваны 23 біблейскія кнігі) змог выдаць у Вільні толькі дзве кніжкі, і то праз шэсць гадоў. Цяпер гэты прабел можна запоўніць. Паведамленне П. Палінскага дае падставу сцвярджаць, што перапынку ў выдавецкай дзейнасці Скарыны ў Вільні амаль што не было, а калі і быў, дык зусім нязначны, які, магчыма, абумоўліваўся тым, што Скарына, як вядомы ў той час вучоны, займаўся і іншымі неадкладнымі справамі, у прыватнасці медыцынскай практыкай.

У сваёй кнізе «Скарына, яго дзейнасць і светапогляд» (Мінск, 1958) мы выказалі меркаванне, што Скарына не абмежаваўся друкаваннем кніг толькі рэлігійнага зместу. Па ўсёй верагоднасці ім выдаваліся і свецкія кнігі, якія маглі не захавацца да нашых дзён, бо езуіты палілі на кастрах усё, што не адпавядала духу каталіцкай царквы. У тым жа рукапісу П. Палінскага на л. 1 зроблены яго рукою наступны запіс: «1516. Grammaticae slawonica» (Славянская граматыка). Аб якой славянскай граматыцы можа ісці тут гутарка і хто быў яе выдаўцом? — на гэта пытанне П. Палінскі не дае адказу. Але не трэба забываць таго, што ён заносіў у свой рукапіс толькі тыя кнігі, якія былі яму добра вядомы і друкаваліся ў Вільні альбо ў іншых беларускіх ці літоўскіх гарадах. Значыць, у дадзеным выпадку маецца на ўвазе славянская граматыка, надрукаваная «рускім» (г. зн. беларускім) выдаўцом, верагодна, у Вільні. Вось гэта і трэба браць за зыходны пункт нашых разважанняў.

Добра вядома, што ў часы Скарыны ні ў Беларусі, ні ў Літве, ні ў Расіі, ні на Украіне выданнем кніг, акрамя яго, ніхто не займаўся. Вядома таксама і тое, што якраз у гэты час Скарына рыхтаваў да выдання на «рускай» мове біблейскія кнігі, якія ён надрукаваў у Празе з 1517 па 1519 год. Таму можна дапусціць, што выдаўцом славянскай граматыкі быў не хто іншы, як Скарына.

У сувязі з гэтым заслугоўвае асаблівай увагі той факт, што ў сваіх прадмовах да біблейскіх кніг Скарына горача прапагандуе вывучэнне «сямі навук вызваленых», сярод якіх першай называе граматыку, як асноўны вучэбны падручнік: «детем малым початок всякое доброе наукы, дорослым помножение в науке, мужем моцное утверженіе». Але калі Скарына так высока цаніў граматыку, то чаму ж не дапусціць, што менавіта з яе ён мог і пачаць свае выданні, каб «вовеликих послужити» «братии своей Руси», як ён падкрэсліваў у прадмовах да біблейскіх кніг. Тым больш, што Скарына выступаў не толькі як прапагандыст свецкіх навук, але і як вяшчун адукацыі на сваёй роднай мове. Ён пісаў: «Не многим учителем бывати, но более умети язык свой справовати».

Для таго, каб выдаць славянскую граматыку, у Скарыны былі ўсе неабходныя дадзеныя. Ён быў «доктарам навук вызваленых», добра ведаў розныя мовы, асабліва славянскія. Сучаснікі адзываліся аб ім, як аб чалавеку «непараўнаўчага і чароўнага таленту, са здзіўляючай шырынёй ведаў» (прускі герцаг Альбрэхт), «з незвычайнымі пазнаннямі і выключна тонкім розумам» (польскі король Сігізмунд I).

Зразумела, пакуль не будзе знойдзена «Славянская граматыка», няма дастатковых падстаў лічыць яе аўтарам Скарыну. Але чаму мы павінны трымацца думкі, што ўсе надрукаваныя Скарыною кнігі намі ўжо знойдзены? Трэба ўлічваць тое, што скарынінскія выданні знаходзіліся паступова: першае паведамленне аб іх мы знаходзім у князя А. Курбскага (другая палова XVI ст.), а затым у полацкага архімандрыта А. Селявы (пачатак XVII ст.); але вывучэнне спадчыны беларускага першадрукара пачынаецца толькі з канца XVIII ст., пасля таго, як І. Бакмейстар, І. Штрытэр і П. Аляксееў знайшлі яго выданні ў розных бібліятэках свету. Аднак і ім не было ўсё вядома: напрыклад, псалтыр Скарыны знайшлі толькі ў другой палавіне XIX ст. Дакументы ж аб ім выяўляюцца і да нашага часу. Так, зусім нядаўна ў Празе вучоны-славяназнаўца А. Флароўскі надрукаваў два вельмі цікавыя дакументы: у адным з іх расказваецца аб паездцы Скарыны ў Маскву з мэтаю выдання і распаўсюджання там сваіх кніг; у другім паведамляецца аб тым, што Скарына некаторы час працаваў у Празе каралеўскім садоўнікам-батанікам (з 1534 года і да самай смерці) і што пасля таго, як ён памёр, засталося вельмі многа кніг, у тым ліку і яго ўласнага выдання.

Патрэбны яшчэ вялікія пошукі ў архівах і бібліятэках, перш за ўсё ў пражскіх і вільнюскіх, каб больш грунтоўна і змястоўна раскрыць спадчыну слаўнага сына беларускага народа. Гэтая задача стаіць перад вучонымі розных галін ведаў: мовазнаўцамі, гісторыкамі, філосафамі, літаратуразнаўцамі, — і трэба думаць, што з цягам часу яна будзе вырашана.

М. АЛЕКСЮТОВІЧ.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, В. Ул. ІВАШЫН, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. Ф. ПРЫХОДЗЬКА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), М. Г. ТКАЧОЎ, І. З. ШАРАХОЎСКІ, І. Б. ШАЦІЛА, Р. Р. ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры—3-22-04, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу

Друкарня выдавецтва «Звязда».

АТ 13171.